І ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ — НЕ МЯЖА 3

ЯК НЕ СТРАЦІЦЬ «БЕЛАЕ ЗОЛАТА»

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 157 (28773)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЛІЧБА ДНЯ

107,6 %

да ўзроўню аналагічнага перыяду 2017 года склалі рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ў I паўгоддзі 2018-га. У агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 64,1 %, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 7,9 %, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя) — 23,6 %, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,4%. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва — грашовыя даходы за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі.

КАРАТКА

• З рэспубліканскага бюджэту за кошт рэзервовага фонду Прэзідэнта Беларусі будзе выдзелена амаль Br77 млн на рэалізацыю мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

• **Зборная Беларусі займае 78-е месца ў абноўленым рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола.**



• Выкладчыкі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава рыхтуюць падручнік па беларускай мове для бежанцаў.

• **Нацыянальны банк Беларусі склаў партрэт сярэднестатыстычнага ўкладчыка. Ім можна лічыць жанчыну, старэйшую за 55 гадоў, якая размясціла ў банках грошай на суму Br7 тысяч, і мужчыну ва ўзросце ад 26 да 60 гадоў, які размясціў у банках грошай на суму Br10,2 тысячы.**

ISSN 1990 - 763X

РЫБАЦКАЕ ШЧАСЦЕ НА ДВАІХ

Адметнасць сясцёр Ірыны ЦЯСЛЮК і Святланы ГЕРАСІМЧЫК не толькі ў тым, што яны блізняты. Абедзве яны яшчэ і заядлыя рыбачкі, таму свой адпачынак не ўяўляюць без вуды. Хоць адзін раз на дзень — ці з ранку, ці пад вечар — іх можна ўбачыць на беразе ракі Свольна, якая працякае паблізу вёскі Чарнавокі Верхнядзвінскага раёна, або ў невялікай лодцы на хуткай рачной плыні.

Сёстры нарадзіліся пад Заслаўем, а ў дарослым жыцці, як гэта часта бывае, лёс развёў па розных мясцінах: Ірына жыве ў сталіцы, Святлана перабралася на поўнач краіны, у край лясоў і азёр. Сустракаюцца зрэдку і толькі летам. Святлана навучыла сястру рыбацкім хітрасцям, і цяпер паміж імі ідзе негалоснае спаборніцтва: хто выцягне самую вялікую рыбіну.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Таямніцы Радзімы

БАГНАЛЭНД — ГЭТА ПА-НАШАМУ!

Экстрэмальныя сцежкі, «дарожныя знакі» і падарожжа ў часе

У балота альбо адразу ўлюбляешся, альбо не прымаеш яго. Так, не кожны чалавек зможа працаваць у палявых умовах пад пільным «наглядам» камароў і сляпнёў, тым больш што там хапае і экстрыму, і бруду. У летнія дні наогул тут будзеце адчуваць сябе як у лазні — там горача і высокая вільготнасць. Але хоць бы раз у жыцці наведаць балота варта.

СТАР. 4

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Камунальныя стасункі

Гаспадарку рыхтуюць да зімы,

і сезоннае адключэнне гарачай вады — адзін з этапаў падрыхтоўкі, адмаўляцца ад якога не збіраюцца

Беларускія камунальнікі цалкам будуць гатовыя да зімы 1 кастрычніка. Пакуль яны нарыхтавалі 1412 тысяч м³ драўнянага паліва і 10 тысяч тон топачнага мазуту як рэзерв для газавых кацельных і замянілі 329 кіламетраў цепласетак. Разам з тым прыборамі ўліку аціплення (за выключэннем Гомельскай вобласці) аснашчана толькі палова дамоў краіны. Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведамілі прадстаўнікі Мінжылкамгаса і Мінэнерга.

Падрыхтоўку арганізацый ЖКГ да восені—зімы штомесячна кантралююць па 60 паказчыках, штотыднёва правяраюць па 11 кірунках працы. Па 40 з 60 нарматываў работы завершаны на 70 % і больш. Пра гэта паведаміў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі.**

— У прыватнасці, падрыхтавана 78 % драўнянага паліва, адрамантавана 87 % сістэм аціплення дамоў і 89 % цеплапунктаў, 80 % дахаў і 91 % стыкаў сцен, — зазначыў ён. — Тым не менш мясцовыя органы ўлады рэгіёнаў у шэрагу кірункаў прымаюць недастатковыя меры для выкання перадзімовых работ.

Гэта датычыцца, у прыватнасці, прафілактычных работ па рамонце цэнтральных цеплапунктаў у Брэсцкай вобласці, нарматыўных характарыстык ізаляцыі цепласетак у Брэсцкай і Гомельскай, перакладкі сетак калектараў у Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. Не задавальняюць Мінжылкамгас і тэмпы замены сетак водаправода ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай абласцях і Мінску.

СТАР. 3

Прыцягнутыя да адказнасці

Анатоль Чорны і Віталь Воўк вызваленыя ад пасад міністра архітэктуры і будаўніцтва і міністра прамысловасці адпаведна.
Указ падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамляе БелТА.

Прычына — невыкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы па комплексным развіцці Аршанскага раёна і неналежнае выкананне службовых абавязкаў. Акрамя таго, да адказнасці прыцягнуты яшчэ шэраг службовых асоб. Строгая вымова аб'яўлена старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалаю Шарснёву. Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Станіслаў Зась і старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Алег Двігалеў папярэджаны аб няпоўнай службовай адпаведнасці.

Таксама ўказам прадпісана старшыні Віцебскага аблвыканкама вызваліць Аляксандра Пазняка ад пасады старшыні Аршанскага райвыканкама і прызначыць на гэтую пасаду Ігара Ісачанку.

Важна працаваць зладжанай камандай

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА прадставіла новага старшыню Аршанскага райвыканкама Ігара Ісачанку актыву раёна.

Фота БелТА.

«Цяпер тут трэба сфарміраваць каманду, гатовую да выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па комплексным развіцці Аршанскага раёна, які павінен стаць прыкладам развіцця сярэдніх гарадоў нашай краіны», — цытуе Наталлю Качанаву БелТА. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыла, што ўсе задачы якасныя і зразумелыя, яны даведзены па ўсіх напрамках: гэта і сацыяльная сфера, і прамысловасць, і сельская гаспадарка. Яна асабліва падкрэсліла, што ўсе задачы, якія ставіць кіраўнік дзяржавы, павінны ў поўнай меры выконвацца кіраўніком любога раёна або горада.

Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу актыву раёна на той факт, што рашэнне зрабіць Оршу прыкладам развіцця сярэдніх гарадоў прадыктавана тым, што ў такіх гарадах назбіраліся праблемы, якія перш за ўсё звязаны з работай прадпрыемстваў. «Праязджаючы па Оршы, бачыш, што некалі быў наведзены парадак, зроблена добраўпарадкаванне, прыцягнуты сур'ёзныя рэсурсы. Але гэта трэба было падтрымліваць у адпаведным стане, каб захаваць на працягу наступных гадоў», — канстатавала яна. У сувязі з гэтым, на яе думку, перш за ўсё неабходна навесці элементарны парадак на прадпрыемствах, прычым у найкарацейшыя тэрміны: на гэта даецца некалькі дзён.

«Што датычыцца стратэгіі развіцця, рашэнняў, якія трэба прымаць на тым або іншым прадпрыемстве, а вы чулі, якія задачы былі пастаўлены, трэба выкарыстоўваць усе вытворчыя магутнасці, наладзіць выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі, якая будзе запатрабавана на знешніх рынках», — лічыць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Наталля Качанава таксама акцэнтавала ўвагу мясцовых оранаў улады на рабоце з насельніцтвам. «Вы павінны заваяваць аўтарытэт у жыхароў Оршы. Гэта вельмі важна. Учора я прыводзіла лічбы: адсюль паступае вялікая колькасць зваротаў у вышэйшыя інстанцыі. І 50 працэнтаў зваротаў звязаны з нараканнямі на работу мясцовых органаў улады. Я проста патрабую ад вас усіх навесці парадак у гэтай рабоце, — сказала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Тады людзі будуць разумець, што прадстаўнікі ўлады думаюць пра сваіх рабочых, і вам не будзе сорамна».

Паводле слоў Наталлі Качанавай, работнікам выканкама, дэпутацкаму корпусу і кіраўнікам прадпрыемстваў Аршанскага раёна неабходна зрабіць вывады і адказна падысці да справы, якая ім даверана. Ацэнка будзе дадзена сур'ёзная, таму важна працаваць зладжанай камандай.

«Зрабіце ўсё, каб гэты раён і горад сапраўды сталі прыкладам для іншых рэгіёнаў у плане сацыяльна-эканамічнага развіцця, добраўпарадкавання і камфортнага пражывання людзей», — дадала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

■ На слыху

Мост — гэта сур'ёзна

Тэма бяспекі пуцеправодаў і ў прыватнасці мастоў апошнім часам на слыху. Нядаўняе прасяданне пуцеправода МКАД у раёне Лошыцы ў Мінску выклікала рэзананс сярод насельніцтва і ў сродках масавай інфармацыі.

Закранаючы тэму рамонту моста ў Лошыцы, **Аляксандр ЯРОШЫК, дырэктар ДП «Гардарбуд»**, паведаміў, што работа па аднаўленні ідзе поўным ходам. Закуплена неабходнае абсталяванне, разгружаны пацярпелы ўчастак дарогі, праведзена яго тэхнічнае абследаванне. Рамонт плануецца скончыць да 7 лістапада 2018 года.

Падкрэсліваючы важнасць утрымання пуцеправодаў і мастоў у бяспечным стане, Аляксандр Пятровіч адзначыў, што «Гардарбуд» вядзе пастаянны маніторынг цэласнасці маставых пакрыццяў і апорных збудаванняў у горадзе. Праводзяцца ўсе адпаведныя мерапрыемствы, у тым ліку вырашаюцца пытанні транспартнай загружанасці, абнаўлення тэхнічнай базы.

Сяргей КУЛАКОЎ.
Фота Яніны ГАРАДЗЕЦКАЙ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Украінскія ваенныя просяць урад павялічыць выдаткі на патрэбы арміі да $4 млрд



Начальнік Генштаба ўзброеных сіл Украіны Віктар Мужэнка лічыць, што ў 2019 годзе на патрэбы арміі ў бюджэце неабходна прадугледзець не менш за 112 млрд грыўняў (каля $4 млрд).

«Мы падлічылі, што для забеспячэння мінімальных патрэб павінна быць сума прыкладна 112 млрд грыўняў. А пакуль нам даюць 82 млрд грыўняў (менш як $3 млрд). І гэтага відавочна недастаткова для таго, каб падтрымліваць узброеныя сілы краіны ў баяздольным стане, я ўжо не кажу пра нарошчванне баяздольнасці», — сказаў ён у інтэрв'ю BBC News Украіна.

Сёлета бюджэт мінабароны Украіны з улікам дадатковых асігнаванняў складае каля 86 млрд грыўняў. Мужэнка таксама нагадаў, што з-за матэрыяльных праблем з арміі працягваецца адток ваенных кадраў.

У мінулым месяцы мінабароны Украіны аб'явіла, што з-за недастатковага ўзроўню грашовага забеспячэння з войска за паўгода звольніліся 11 тысяч афіцэраў і яшчэ 18 тысяч павінны звольніцца да канца 2018 года.

Трамп падпісаў загад, які спрашчае працэдуру прымянення кіберзброі

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падпісаў загад, які пераглядае дырэктыву па мерах гарантавання кібербяспекі, паведамляе газета Wall Street Journal. Дырэктыва № 20, падпісаная папярэднікам Трампа Баракам Абамам, уяўляе сабой план па гарантаванні кібербяспекі, у якім змяшчаецца шырокі набор стандартаў, што вызначаюць дзейнасць федэральных органаў у барацьбе з пагрозамі ў кіберпрасторы.

Як адзначае выданне, у загадзе Трампа «здымаюцца абмежаванні» на ўмовы, пры якіх прэзідэнт можа пайсці на «прымяненне кіберзброі супраць сваіх праціўнікаў». Дэталі змен не прыводзяцца, аднак крыніца з ліку афіцыйных прадстаўнікоў ахарактарызавала загад як «наступальны крок наперад», які можа спрыяць правядзенню ваенных аперацый, прадухіленню замежнага ўмяшання ў амерыканскія выбарчыя працэсы і выпадкаў крадзяжоў амерыканскай інтэлектуальнай уласнасці.

У Германіі ўзаконілі трэці пол

Федэральнае міністэрства ўнутраных спраў Германіі заявіла, што ўрад краіны распарадзіўся замацаваць так званы трэці пол у кнігах запісу актаў грамадзянскага стану.

Па звестках ведамства, зараз у Германіі будзе існаваць «інтэрсексуальны» пол. Як адзначаецца, за кошт гэтай ініцыятывы ўлады ФРГ маюць намер дапамагчы людзям, якія не могуць вызначыць сваю палавую прыналежнасць.

Раней паведамлялася, што канстытуцыйны суд Германіі дазволіў грамадзянам краіны пазначаць у сваіх дакументах трэці пол. Як сцвярджалася, немцам дазволілі пазначаць у дакументах пол, адрозны ад мужчынскага або жаночага.

ВАМ АДКАЖУЦЬ КАМПЕТЭНТНЫЯ АСОБЫ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 18 жніўня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў краіны з 9 да 12 гадзін адкажуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ, тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ, тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблсавета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЯНКЕВІЧ, тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ, тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА, тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблсавета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ, тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарсавета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК, тэл. 8 017 222 44 44

■ Навука

Узаемны інтарэс на Паўднёвым полюсе

Падчас правядзення 11-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі ў 2018—2019 гадах беларускія і расійскія палярнікі будуць выконваць сумесны навуковы праект.

Ён прысвечаны вымярэнню альбеда (маецца на ўвазе характарыстыка адбівальнай здольнасці розных тыпаў падсцілаючай паверхні Антарктыды). З гэтай мэтай на тэрыторыі беларускай станцыі паўтара-два месяцы будзе знаходзіцца расійскі вучоны для выканання сумесных работ, звязаных з кліматычнымі даследаваннямі. Апошнія правядуць з выкарыстаннем беларускай і расійскай апаратуры.

Па словах **старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА**, у беларускіх вучоных выбудоўваецца стратэгічнае партнёрства з расійскім бокам. «У далейшым нашы планы па ўмацаванні сваіх пазіцый на Паўднёвым полюсе мы звязваем з раўнапраўным партнёрствам з Расійскай Федэрацыяй, разлічваем на прафесійную і таварыскую падтрымку з боку расійскіх калег», — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў.

Два дні ў Беларусі знаходзілася з візітам дэлегацыя Расійскай антарктычнай экспедыцыі Інстытута Арктыкі і Антарктыкі Расгідрамета (г. Санкт-Пецярбург). Члены дэлегацыі прынялі ўдзел у пашыраным рабочым пасяджэнні міжведамаснай камісіі Рэспублікі Беларусь па пытаннях Антарктыкі, якое адбылося ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама ў рабочай сустрэчы ўдзельнікаў двухбаковай рабочай групы.

З 2013 года стратэгічнае супрацоўніцтва НАН Беларусі з расійскім бокам ажыццяўляецца ў рамках «Пагаднення аб супрацоўніцтве ў Антарктыцы», заключанага паміж урадамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У прыватнасці, расійскі бок сур'ёзна дапамагае ў транспартна-лагістычным забеспячэнні дзейнасці беларускай экспедыцыі ў Антарктыцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

І ЧАТЫРЫ ТЫСЯЧЫ — НЕ МЯЖА

Механізатары Магілёўскай вобласці Аляксей Макосаў і Мікалай Мінчанка першымі ў краіне намалацілі чатыры тысячы тон збожжа

Фота Марыям ТАБАГАРЫ.

Агракамбінат «Зара» ў Магілёўскім раёне працягвае дэманстраваць высокія тэмпы ўборачнай кампаніі. Яшчэ тыдзень таму тут віншавалі першых у вобласці трохтысячнікаў жніва — **старшага камбайнера Аляксея МАКОСАВА** і яго **памочніка Мікалая МІНЧАНКУ**. І вось яны зноў у лідарах. Учора з раніцы пераможны экіпаж сустракалі на ўскрайку поля прадстаўнікі кіраўніцтва вобласці, мясцовай улады, прафсаюзнай арганізацыі, журналісты, каб павіншаваць руплівых механізатараў з новым рэкордам — чатыры тысячы тон збожжа. Гэта першы ў краіне экіпаж, які дасягнуў такіх высокіх вынікаў. Камбайнеры атрымалі падзячныя лісты, грашовыя прэміі і каштоўныя падарункі. Граматамі і падарункамі ўшанавалі таксама трохтысячнікаў (два экіпажы) і двухтысячнікаў (сем экіпажаў) гаспадаркі, а таксама кіроўцаў, якія перавезлі дзве і тры тысячы тон ураджаю.

— Вельмі прыемна, калі тваю працу адзначаюць, — падзяліўся эмоцыямі Аляксей Макосаў. — Але высокія паказчыкі — гэта ў першую чаргу заслуга ўсіх работнікаў гаспадаркі. Наша задача толькі добрасумленна працаваць. Ставім са сваім памочнікам мэту сабраць яшчэ тысячу і болей тон ураджаю.

На сённяшні дзень збожжавыя і зернебабовыя ў «Зары» сабраны на 70 % плошчаў, іх ураджайнасць склала больш за 67 ц/га.

У вобласці практычна завяршыў уборку збожжавых і зернебабовых Кіраўскі раён. На 98 % убраны плошчы ў Клічаўскім раёне. Сярод лідараў жніва — 108 экіпажаў, у тым ліку 15 маладзёжных: яны намалацілі тысячу і болей тон збожжа.

На раніцу 16 жніўня на Магілёўшчыне было ўбрана 82 % збожжавых і зернебабовых, валавы намалот склаў 666,2 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 26,9 цэнтнера з гектара. Па ўраджайнасці лідзіруе Шклоўскі раён — 44 цэнтнера з гектара, другое і трэцяе месцы ў горацкіх (35,5 ц/га) і магілёўскіх (31,8 ц/га) хлебаробаў адпаведна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.



Гаспадарку рыхтуюць да зімы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выдача пашпартоў гатоўнасці дамоў і цеплакрыніц да ацяпляльнага сезона — таксама адзін з напрамкаў падрыхтоўкі да зімы.

— Сёлета пашпартызацыі падлягае 28,7 тысячы спажыўцоў цеплаэнергіі (зарэгістравана каля 11,5 тысячы) і 13,6 тысячы ведамасных цеплакрыніц (атрымалі пашпарт амаль пяць тысяч), — расказаў **Арцём МЕДЗВЯДОК, в. а. начальніка аддзела дзяржаўнага энергетычнага і газавага нагляду і аховы працы Міністэрства энергетыкі Беларусі.**

Амаль трэць кацельных і іншых цеплакрыніц, якія абслугоўваюцца ЖКГ, такія пашпарты ўжо атрымалі, і каля паловы (28 296) дамоў падрыхтаваны да атрымання гэтых дакументаў.

Энергетычная галіна пачала рыхтавацца да сёлетняй зімы адразу пасля адключэння ацяплення па вясне, заўважыла **Вольга РЫБАКОЎСКАЯ, намеснік начальніка вытворча-тэхнічнага ўпраўлення Міністэрства энергетыкі Беларусі:**

— На 10 жніўня капітальна і сярэдне адрамантаваны 39 адзінак цеплаэнергетычнага абсталявання. Капітальна адрамантаваны 10 генератараў, высакавольтных выключальнікаў, амаль 15 тысяч кіламетраў лініі электраперадачы напружаннем 0,4—750 кВ. Комплексны рамонт выкананы на 41 падстанцыі, рэканструявана і адрамантавана 133,8 км цепласетак.

Для павышэння надзейнасці работы лініі электраперадачы напружаннем 10—750 кВ расчышчана 8300 гектараў прасек. А для больш устойлівага функцыянавання з дапамогай абароненых пакрытых правадоў рэканструявана 435 кіламетраў лініі электраперадачы, якая праходзіць па лесе.

105 кабельных ліній электраперадачы, якімі карыстаюцца спажыўцы, пакуль застаюцца пашкоджанымі. А ў 13 прамысловых спажыўцоў электраўстаноўкі не адпавядаюць першай катэгорыі па надзейнасці энергазабеспячэння. Мінэнерга выдала распараджэнне ліквідаваць гэтыя недахопы да 1 кастрычніка.

* * *

Мінжылкамгас прапрацоўвае таксама пытанне магчымага змяншэння двухтыднёвага тэрміну планавага адключэння гарачай вады, аднак пакуль казаць пра змены рана. Двухтыднёвы тэрмін неабходны для правядзення комплексу работ для падрыхтоўкі сістэм халоднага і гарачага водазабеспячэння да ўстойлівай работы ў асенне-зімовы перыяд. Такі перыяд вызначаны ТКП (тэхнічны кодэкс усталяванай практыкі), хоць былі прыклады, што работы выконвалі за 5-7 дзён, але іх няшмат, падкрэсліў Генадзь Аксціловіч:

— Тэарэтычная магчымасць паменшыць тэрміны ёсць, аднак неабходна ацэньваць работу ў комплексе. Мы зыходзім з тэхналогіі выканання работ. Гэта як з «капрамонтам за месяц». Удалося зрабіць не таму, што нешта рабілі хутчэй, а таму, што на аб'екце былі належна арганізаваны работы (падрыхтаваны персанал, матэрыялы, праведзена арганізацыйная работа з жыхарамі). Напэўна, ёсць тэхнічная магчымасць скараціць тэрмін, напрыклад, за кошт прамыўкі сістэм ацяплення або іх выпрабаванняў пад ціскам... Але калі для скарачэння тэрміну правядзення прафілактычных работ неабходна ўкласці больш фінансавых сродкаў, чым каштуюць самі работы, то ці мэтазгодна гэта рабіць, толькі каб скараціць самі работы на тыдзень? Магчымасць памяншэння тэрміну работ абумоўліваецца станам сеткі. Калі яна новая, то і работы па яе абслугоўванні і прафілактычным рамонце выконваюцца хутчэй. Калі сеткі эксплуатуюцца доўга, узнікае неабходнасць у выкананні дадатковых работ. Спецыялісты павінны ацаніць усё гэта комплексна і адказаць: магчымае скарачэнне тэрмінаў ці не.

Ён дадаў, што арыентавацца на замежны вопыт у гэтым пытанні не варта, бо ў многіх еўрапейскіх краінах практычна адсутнічае такое паняцце, як цэнтралізаванае ацяпленне. «Яны абагравацца з дапамогай газавых ці электрычных элементаў, якія знаходзяцца непасрэдна ў доме. У іх няма неабходнасці ў прафілактычным рамонце сетак, бо няма саміх сетак».

15 жніўня адбылася калегія ЖКГ, на якой спецыялісты абмяркоўвалі рабочыя пытанні міністэрства. Яны датычыліся функцыянавання і арганізацыі дзейнасці таварыстваў уласнікаў, зверкі чаргі ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і пытанняў камерцыйнага жылля. Усе змены, якія датычацца гэтых пытанняў, падрыхтаваныя ва Указ № 563, вырашана ўнесці адразу ў новы праект Жыллёвага кодэкса.

Ірына СІДАРОК.

■ Надвор'е

ЦЁПЛА І МОКРА

Цёплае і дажджлівае надвор'е чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу, 18 жніўня, у асобных раёнах краіны, а днём на большай частцы тэрыторыі Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Вецер будзе няўстойлівы слабы, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 градусаў цяпла, днём — плюс 22—29 градусаў. У нядзелю, 19 жніўня, дажджоў стане менш. Ноччу і раніцай месцамі чакаюцца слабыя туманы. Вецер няўстойлівы слабы, пры навальніцах парывісты. Уначы будзе плюс 13—18 градусаў цяпла, днём — 22—29.

Паводле папярэдняга прагнозу, у пачатку наступнага тыдня рэзкіх змяненняў у характары надвор'я не чакаецца, а жнівень працягне радаваць цяплом

Умовы змяняюцца, прызёр застаецца

Пяты раз запар праграміст Генадзь Караткевіч стаў самым лепшым на Google Code Jam.

Малады чалавек родам з Гомеля і ў гэтым абласным цэнтры пачынаў вучыцца праграмаваць. Сёлета ён зноў перамог на міжнародных спаборніцтвах па праграмаванні Google Code Jam у Таронта. Спаборніцтвы, якія праходзяць на працягу 15 гадоў, з'яўляюцца адным з самых масавых і прэстыжных чэмпіянатаў у свеце. Сёлета колькасць удзельнікаў перавысіла 60 тысяч чалавек.

Генадзь Караткевіч набраў 104 балы. Ён апярэдзіў Каміла Дэбоўскі з Польшчы (96 балаў) і Макота Саэджыма з Японіі (86 балаў). Па ўмовах спаборніцтваў, за чатыры гадзіны трэба было рашыць пяць алгарытмічных задач. На рашэнне адной з іх — Two-Tiling, падобнай на галаваломку, Генадзь патраціў паўтары гадзіны. Пры тым што за задачу давалася не вельмі шмат балаў, менавіта яна прынесла перамогу нашаму праграмісту. Бо, як высветлілася, многія з ёй увогуле не справіліся.

Сёлета ўпершыню тэсціраванне вынікаў праводзілася на камп'ютарах журы — раней удзельнікі самі запускалі свае рашэнні на праверку, а ў сістэму загружалі толькі адказ. Таксама была перапісана і цалкам абноўлена сістэма, на якой праводзіліся спаборніцтвы.

Цяпер 23-гадовы Генадзь Караткевіч паступае ў аспірантуру Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі. Адзін з экзаменаў пераможца Google Code Jam здаў на «выдатна» дыстанцыйна, калі знаходзіўся ў Канадзе.

Нагадаем, Генадзь Караткевіч — адзін з самых тытулаваных спартыўных праграмістаў у свеце. Ён з'яўляецца шматразовым пераможцам міжнародных і ўсерасійскіх чэмпіянатаў і турніраў па спартыўным праграмаванні. Дарэчы, прыз за першае месца ў апошніх спаборніцтвах склаў $15 тысяч.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Крымінал

Шэсць кілаграмаў ювеліркі

спрабавалі схаваць зламыснікі ў міжстолевай прасторы купэ вагона пасажырскага цягніка, які рухаўся з Санкт-Пецярбурга ў Кіеў.

Прэс-служба гомельскай мытні паведамляе, што буйную партыю ювелірных вырабаў затрымалі ў пункце пропуску «Церуха» — на граніцы з Украінай. Пры правядзенні мытнага нагляду пасажырскага цягніка былі знойдзены чорныя пакеты. У іх было больш за 550 падвесак, ланцужкоў, бранзалетаў і іншых прадметаў. На бірках вырабаў пазначана, што яны выраблены са срэбра і маюць пазалоту. Папярэдне агульны кошт тавару, які перамяшчаўся незаконна, склаў больш за Br70 тысяч. Вырабы канфіскаваны і накіраваны на экспертызу ў мытную лабараторыю.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Украў пінжак за дзве тысячы

У сталічную міліцыю звярнуўся дырэктар адной з крамаў з просьбай устанавіць асобу, якая здзейсніла крадзеж пінжака коштам каля дзвюх тысяч рублёў.

Праваахоўнікі ўстанавілі, што зладзюжкам, які ўкраў пінжак, а таксама жаночыя штаны, быў раней неаднаразова судзімы за аналагічныя ўчынкі 33-гадовы жыхар сталіцы. Агульная сума ўрону ад апошніх крадзяжоў склала 2,3 тысячы рублёў. Вядома, што ўкрадзены пінжак мужчына прадаў на адным з гарадскіх рынкаў. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА

БАГНАЛЭНД — ГЭТА ПА-НАШАМУ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вы ўбачыце неверагодную прыгажосць, напрыклад, сосны, што растуць на балоце, — сапраўдны беларускі «бансай». Не высокія, каля метра ці крыху вышэйшыя, яны могуць прымаць розныя дзівосныя формы. А вывернутае карэнне (на балоце каранёвая сістэма не стрыжнёвая, а паверхневая) у прыцемках наогул нагадвае нейкія фігуры. Гэта можна выкарыстоўваць у турызме і расказваць гасцям пра балотнікаў і нейкіх неверагодных таямнічых пачвар. А яшчэ балота — выдатны матэрыял для вывучэння.

— Студэнцкая практыка на балоце — як рэаліці-шоу. Гэта новыя адчуванні, пахі, колеры, смакі. Задзейнічаны ўсе органы пачуццяў, — заўважае **загадчык кафедры батанікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Алег СОЗІНАЎ.** — Зараз у моладзі вялікі дэфіцыт рэальнасці. Мне не падабаецца імкненне зрабіць навучанне віртуальным, калі нават замест лабараторыі выкарыстоўваецца камп'ютар. Тыя ж дыстанцыйныя формы, вэбінары не могуць замяніць традыцыйных заняткаў. Ды і самі студэнты заўважаюць, што ім цікавейшыя жывыя зносіны, дыскусія, узаемадзеянне. На жаль, сёння большая частка моладзі «паркетная», яна хоча, каб было зручна, каб не капала на галаву, не кусаліся мошкі. Насамрэч прырода не такая, як на экране маніторaў. Студэнты думаюць, што на балоце небяспечна, іх можа зацягнуць у багну. Але калі прыязджаюць — здзіўляюцца. Як папрацуюць, перапэцкаюцца ўсе, расянку пакормяць, дык іх адтуль не выгнаць.

Магчыма, менавіта недахоп такіх заняткаў — адна з прычын таго, што мала маладых людзей выбіраюць прафесіі, звязаныя з «жыццём» на балоце. Так, справа гэта не з лёгкіх, даводзіцца працаваць у любое надвор'е — і ў спёку, і ў холад, — пераадольваць вялікія адлегласці. А часам на балоце гэта не так проста: бывае, што на тое, каб прасунуцца на метраў сто, ідзе каля гадзіны. Напрыклад, каб зрабіць карту расліннасці, вучоныя павінны выйсці на пэўныя месцы, дзе яны будуць апісваць усе віды. Трэба так разлічыць свой час, каб да прыцемкаў выбрацца з балота. Але прырода часта падкідвае розныя сюрпрызы. Так, на месцы вы можаце сустрэць зусім не тое, што было на карце. Калі там завяліся бабры, яны кардынальна змянілі тэрыторыю. І каб дабрацца ў патрэбнае месца, трэба плыць. Бывае, што дзейнасць баброў прыносіць карысць экасістэме, але часта яны наносяць і шкоду чалавеку. Асабліва церпяць лясныя гаспадаркі: калі падымаецца ўзровень вады, знішчаюцца буйныя дрэвы і нават цэлыя лясныя масівы. Супрацьстаяць звярку не так проста, разбураныя плаціны ён здольны аднавіць за ноч.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Я нават казаў заолагам: «Займіцеся дрэсіроўкай баброў, каб яны рабілі плаціны там, дзе трэба, гэта ж якая эканомія», — жартуе Алег Созінаў. — А звяркі маглі б яшчэ і сэрвісам займацца — рамантаваць свае збудаванні».

На балоце вас могуць чакаць неверагодныя сустрэчы. Неяк геабатанік працаваў на Дзікім (балота ў Белавежскай пушчы), рабіў апісанне, а ззаду стаяў мядзведзь і назіраў за ім. Ён не ведаў, што дзеянні чалавека для яго — цікавае відовішча. Ці ж часта ўбачыш, як чалавек корпаецца ў мурашніку? Ці ў дуплі? Ці ў гнілой калодзе? Мядзведзь, вядома, не ведаў, што чалавек шукае, але ён ведаў, што ў мурашніку, дуплі ці калодзе можна знайсці ежу. І ён пачаў чакаць, калі чалавек сыдзе, каб самому пакарыстацца. Але чалавек не сыходзіў. Мядзведзь пачаў злавацца, пачаў рыкаць, але чалавек не звяртаў на яго ўвагі. Тады мядзведзь пайшоў у лес, але праз некаторы час вярнуўся. Ён вырашыў, што чалавек — гэта нейкая дзіўная істота, якая не ведае, што ежа ў мурашніку, і ён вырашыў яго навучыць. Мядзведзь пачаў ламаць дрэвы, каб паказаць, што ежа ў дуплах

КАСІЎ ЯСЬ... І ПАД ЯСЯ

Некалі ў савецкія часы ў кожнага калгаса і саўгаса былі свае шэфы. У нашага — «За мір» — дык нават не абы-якія: кінастудыя «Беларусьфільм», арганізацыя на той час досыць багатая. Ва ўсякім разе і тэхнікі ў яе хапала, і штат быў вялікі.

А ў саўгаса, можна сказаць, вузкая спецыялізацыя — вырошчванне сартавога насення. Нідзе ні лапічка пустой зямлі не пакідалася! Нават вакол слупоў усё абкопвалі, каб пустазелле не рассявалася, каб потым зерне чыстае было.

Ім саўгас забяспечваў не толькі ўсе гаспадаркі раёна, — нават з іншых прыязджалі. Гэтым «ганцам» за тры, а то і за чатыры тоны фуражнага зерня давалі адну тону сартавога, дарагога, якое і вырошчваць, і ўбіраць трэба было з розумам: каб урадзіла, каб на корані даспела, каб не абсыпалася.

Праз сушылку яго таксама не праганялі: звозілі на такі, разоў колькі лапацілі шуфлямі. І вось на гэтыя работы ўжо «выводзілі» ўсіх: настаўнікаў, вучняў-падлеткаў, спецыялістаў саўгаса...

На падмогу тады прыязджалі і шэфы, як правіла, мужчыны. І яны, каб спадабацца мясцовым дзяўчатам ды маладзіцам, часам выдавалі сябе за вялікіх начальнікаў, за рэжысёраў, «касілі» пад аператараў (хоць асобныя, як выглядала, маглі хіба цягаць рэквізіт)...

Таму, відаць, слава найлепшага вось з гэткіх «касцоў» дасталася не ім, а нашаму тутэйшаму электразваршчыку Пецю, прычым выпадкова.

Справа ў тым, што Пеця, як зараз сказалі б, фанацеў ад «Песняроў». Ён да таго ж і знешне трохі змахваў на Уладзіміра Мулявіна, асабліва — калі адгадаваў такія ж валасы і вусы...

Дык вось насталі ў саўгасе гарачыя дзянькі — жніво. На ток — на прасушку зерня, на адгрузку мяшкоў — выйшлі ўсе і мясцовыя, і прыезджыя, у тым ліку — нейкія зусім маладзенькія дзяўчаткі з кінастудыі (не ведаю, што яны там рабілі: можа, плёнкі якія склейвалі?).

Тут жа, на таку, то ўсе разам, а то па чарзе, яны сталі прыглядацца да нашага Пеці. («Песняры» тады на ўвесь Саюз грымелі!) А найсмялейшая з дзяўчат дык нават падышла: ледзь жывая ад хвалявання, спытала:

— Вас таксама на ўборку прысылалі?

Пеця, вядома ж, змікіціў, за каго яго прынялі, — стрымана адказаў:

— А што рабіць?.. Трэба ж дапамагаць вяскоўцам.

— Ну, вядома! — дружна згадзіліся дзяўчаты. І, шчыруючы паблізу, нават не падумалі, што «Песняры» наўрад ці мелі дачыненне да іх кінастудыі, да нашага саўгаса і што ўрэшце не мулявінская гэта справа ў вёсцы Забалацце мяхі на машыны грузіць.

Нашы, мясцовыя дзяўчаты (а яны ўсё чулі і бачылі) з наіўнасці гарадскіх толькі пасмяяліся. Аднак расчароўваць іх не сталі: Мулявін дык Мулявін. А таму яны, можа, і сёння дзецям расказваюць, што сустракаліся з сапраўдным песняром, што размаўлялі з ім, што побач працавалі.

Дарэчы, пасля гэтага выпадку Пецю (не дурны быў хлопец і нават трохі артыст) ужо іначай людзі не звалі: прыляпілася да яго знакамітае прозвішча, праз гады — хіба пакарацеўшы: быў Мулявін, стаў проста Муля.

Л. М. Чыгрынава,

г. Мінск.

«ЗАБАСТОЎКА» НА ЖНІВЕ

Мы, школьнікі першых пасляваенных гадоў, калі і адпачывалі ў час летніх канікулаў, то хіба ад вучобы. Ад працы — неяк не даводзілася, бо нараўне з дарослымі (і за той самы «голы» працадзень!) шчыравалі то на лузе, то на калгасных палетках. Зранку, бывала, спяшаліся на калгасную канюшню, запрагалі якога каняку і прычэпленымі да ворчыкаў плугамі-акучнікамі дапазна абганялі бульбу, альбо касілі, сушылі, звозілі сена, да сёмага поту завіхаліся на малацьбе...

Як зараз бачу: мы, двое падлеткаў, можна сказаць, валімся з ног ад стомы, але скідваем з тарпы важкія снапы жыта, якія нехта з дарослых дзядзькоў запіхвае ў «пашчу» малатарні ды яшчэ і пакрыквае: «Давайце, хлопцы, давайце!»

«Даваць» — цяжка, але мы ведаем, што снапы тыя трапілі да нас «з падачы» гэткіх жа непаўналетніх дзяўчатак. Ва ўсякім разе трохі старэйшая за мяне сястра ўспамінала, як па жытнім полі, натужна стракочучы, рухалася жняярка, як кіроўца, падганяючы парку коней, скідваў на пожню збажыну, і як яны, дзеці, можна сказаць, пад спякотным сонцам, не разгінаючы спін, вязалі яе ў снапы.

Дык вось неяк раз дзяўчаткі не вытрымалі — вырашылі... забаставаць, у другой палове дня не выйсці на работу.

Яны чулі, як да двара падыходзіў брыгадзір, як звычна крычаў: «Ну дзе вы там? Пара... Жняярка ў полі!»

У адказ яму — хіба цішыня ды прыглушанае хіхіканне. І толькі потым ужо разуменне, што з брыгадзірам жарты кепскія, з матулямі ды ба́цькамі — і зусім...

А таму дзяўчаты хуценька сабраліся і бягом у поле, дзе ўжо ляжала скошаная збажына. Похапкам яны сталі збіраць яе, доўгімі перавясламі вязаць у снапы.

Не заўважылі, як і сонца села: канчалі работу пры месячным святле, аднак настрой ад гэтага не сапсаваўся. Ва ўсякім разе, праходзячы ля брыгадзіравай хаты, яны дружна праспявалі прыпеўкі пра шчаслівае калгаснае жыццё...

Віктар Несцяровіч,

г. Лагойск.

ПА ЗАКОНЕ ЦІ ПА СПРАВЯДЛІВАСЦІ?

Збіраць падаткі цяпер прасцей простага. Інспектарам можна і з-за стала не ўставаць: патыцкаў на кнопкі ў камп'ютары і ўся работа. Плацельшчыкі ўсё самі павінны: дэкларацыі ды справаздачы падаць, грошы пералічыць... А ўжо тады і спаць спакойна можна.

Зрэшты, не: перад гэтым трэба падатковаму інспектару пазваніць.

Ён, той дзядзька ў рэкламе, як быццам, нішто сабе, але ж я званіць яму не буду, хоць павагі ён і заслугоўвае, бо працаваць інспектарам зможа хіба «сапраўдны арыец»: нікому ніякай літасці, ніякіх саступак, нават у драбязе. Як казаў Задорнаў, не разумею, краінам Афрыкі дзяржава прабачыла мільёны долараў, а ты паспрабуй, не заплаці пяць капеек — адразу ж санкцыі.

...Так, між іншым, і раней было, хоць сама працэдура «адымання грошай» праходзіла, вядома ж, па-іншаму: сельсавет складаў спісы, што ў каго ёсць (то-бок нешта накшталт дэкларацыі, дзе падаткам абкладалася ўсё, што варушыцца і не варушыцца, што маеш і чаго не маеш). Ён жа, сельсавет, вылічваў, хто за што і колькі вінен плаціць. Чым — калі ў калгасах заробкаў не было — не цікавіла ўжо нікога...

Але ж людзі плацілі (бо іначай — суд, «катарга» ды іншыя «радасці»), хоць, можа, і не адразу. У прыватнасці, мясцовы фінагент (па-цяперашняму — інспектар, асабліва, калі ён жанчына) не заўжды мог падаткі спагнаць. У гэтым выпадку браўся за справу раённы фінаддзел. Яго людзі, як чорт крыжа, баяліся.

«Дык вось неяк раз сабраліся райфінаддзелаўцы «вытрасаць нядоімку». Для большай саліднасці ўзялі ў дэпутацыю прадстаўнікоў розных сельсаветаў, у тым ліку і мяне, — расказвала цётка Пашка. (Ёй, між іншым, 96-ы пайшоў, яна Сталіна бачыла). — Цэлы «козлік» людзей набіўся і гайда па аддаленых вёсках. У першай жа спыніліся ля адной халабуды, падпёртай каламі, дзе жыла бязмужняя, але прытым — шматдзетная жанчына. За гераізм тады гэта не лічылася (твае дзеці — твае і клопаты), ніякіх дапамог ці льгот не давала. Плаці падаткі — і ўсё тут!

Каб спагнаць, у тую развалюху паслалі маладога агенціка: разведай, маўляў, дома гаспадыня ці не. Хлопец пайшоў. І ён, трэба сказаць, не быў «сапраўдным арыйцам» — ён за ўсіх заступаўся, усіх шкадаваў...

Карацей, хвілін праз пяць да «козліка» вярнуўся і кажа:

— Ведаеце, сёння мы тут нічога не возьмем: роды ў гаспадыні.

Што рабіць камісіі? Роды дык роды: ну не звяры ж яны? Сабраліся ад'язджаць, як раптам з хаты на ганак выбягае... «парадзіха», крычыць:

— Калі ласачка, госці дарагія, заходзьце! Я тут самагонку якраз ганю — пачастую вас за вашу дабрыню!

Ад неспадзеўкі прыезджыя проста аслупянелі, а той агенцік яшчэ і спалатнеў, бо ён жа быў у хаце, бачыў, чым займаецца неплацельшчыца, — вырашыў пашкадаваць яе і дзяцей, адвесці ад хаты бяду (што пры гэтым казаў — невядома)... А жанчына як зразумела, так зразумела: вырашыла і яму, і ўсёй яго «камандзе» аддзячыць...

А вось каманда, як і варта было чакаць, гэты парыў не ацаніла: склала акт, канфіскавала самагонны апарат і «новынароджаную» самагонку.

Ехаць некуды далей з гэтымі трафеямі ўжо не выпадала — прыйшлося вярнуцца ў Рагачоў. І пры гэтым усю дарогу «варажыць» — нармальная тая баба ці ўсё ж такі не?

Да кансэнсусу, кажучы сённяшняй мовай, фінансісты так і не прыйшлі: не зразумелі, ЯК, гадуючы дзяцей, можна заставацца вось гэткай дурніцай?! Успаміналі, як жанчына выбегла з хаты, якімі словамі запрашала зайсці, смяяліся...

Нявесела было толькі таму маладзенькаму агенціку: з яго боку — супраць відавочнага не папрэш — назіралася яўнае ўкрывальніцтва, за якое некалі можна было і «загрымець»...

На ягонае шчасце, час ужо быў трохі іншы, але цётка Пашка казала, што ў фінаддзеле тога агенціка больш ніколі не бачыла. Відаць, проста звольнілі? Па ўласным жаданні, па законе...

А ў жыцці па законе і па-людску зусім не адно і тое ж. І было, і ёсць.

Соф'я Кусянкова,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Неасабісты суб'ектыў

ПЕРСЕІДЫ ВЯРТАЮЦЦА ДА ЗЯМЛІ

Ёсць у гэтым Сусвеце нешта, што не знікае без следу і назаўжды

ІСЁЛЕТА пад зорным дажджом Персеідаў, які найбольш шчодра сыпаўся з неба ў ноч з 12-га на 13-га, пастаяць не атрымалася. Пакаціліся ў прорву Сусвету сотні незагаданых, а значыць, і няспраўджаных жаданняў, пранёсся наш блакітны шарык праз бліскучы след каметы Свіфта — Татла, якая сама набліжалася да Зямлі дваццаць шэсць гадоў назад, а наступны раз будзе гэтаксама блізка аж у 2126-м. Але хвост свой з метэораў распушыла на дзесяцігоддзі, вось і трапляе ў яго наша планета штогод у жніўні, а мы, дурныя рамантыкі, кожны паасобку, стаім задраўшы галовы і радуемся, бы дзеці, угледзеўшы імгненны вогненны росчырк на небе, верачы, што загаданае ў гэты момант абавязкова спраўдзіцца. Не ўлічваючы толькі таго, што адну і тую ж знічку могуць бачыць на небе ў розных месцах некалькі дзясяткаў, а то і соцень чалавек, і што рабіць тады яму, Небу, у сэнсе вяршыцеля лёсаў, чыё жаданне выконваць, а чыё — адкласці на паліцу Вечнасці... Але ж у гэтым штогадовым паўтарэнні ёсць і надзея, і апраўданне: не атрымалася сёлета — а вось налета абавязкова.

УЯЎЛІКІМ горадзе, у якім давялося сёлета быць, калі раскашавалі Персеіды, зорнага ліўня проста не відаць. Ды што там зоркі — каб убачыць тое самае славутае месяцовае зацьменне ў самым яго апагеі, давялося некалькі разоў абысці вакол свайго дома ў сталічным Сухараве. Загадка была яшчэ тая: нібыта і ведаеш, дзе месяц павінен быць, няхай сабе і схаваны ценем, але ж — павінен, углядаешся — няма месяца! І толькі з трэцяга заходу стомленыя ўжо ад астранамічных практыкаванняў вочы выхапілі-такі блякла-кволенькую акантоўку захінутай ценем поўні. Яркія вулічныя ліхтары «з'елі» і зрабілі зусім нябачнай і яе, і абяцаны асабліва чырвоны ў тую ноч Марс. Гэта толькі ў вершах больш значнае бачыцца на адлегласці, а ў рэальным жыцці звычайная лямпачка на сотню ват здольная зацьміць нават найярчэйшую з найярчэйшых зорак.

ІНШАЯ справа — у вёсцы, дзе пра вулічныя ліхтары, якіх ажно тры штукі, успамінаюць толькі ўзімку ці позняй восенню. Выходзіш на двор — і цябе нібы накрывае чорна-аксамітнае пакрывала, расшытае дзівоснымі дыяментамі, складзенымі ў выкшталцоныя ўзоры. Здаецца: варта толькі працягнуць руку — і любы з гэтых каштоўных каменьчыкаў апынецца ў тваёй далоні. Гэткае імгненнае ілюзорнае адчуванне ўласнай усёмагутнасці, ад якога аж дух займае. А ў садзе гупаюць у росную траву недаспелыя яшчэ антонаўкі, і кожны раз думаеш, што гэта прызямлілася ледзь не табе пад ногі знічка, момант падзення якой ты чамусьці не згледзеў. Крыху ачмурэлы ад зорнай раскошы Млечнага Шляху, што раскінуўся праз увесь нябесны далягляд, успамінаеш, што калісьці беларусы называлі яго Дарогай Продкаў, і ўжо, здаецца, не тысячы тысяч зорак на ім, а сляды ўсіх, хто ступіў ужо з Зямлі ў Вялікае і Недасяжнае, адкуль ніхто яшчэ не вярнуўся...

ЗОРНАЕ неба над роднай хатай — гэта, бадай, адзіная непарушная канстанта, якая застаецца з чалавекам на ўсім яго зямным шляху наяве, не ператвараючыся цягам жыцця ў светлыя згадкі ці незваротныя ўспаміны. Становяцца вялікімі і падаюць пад сякерай ці ад ветру дрэвы, руйнуюцца і ўзводзяцца новыя пабудовы, зарастаюць хмызамі лугі, а лясы становяцца полем, рэкі ператвараюцца ў ручаінкі... Гадуюцца дзеці, не паспееш азірнуцца — нараджаюць сваіх дзяцей, паміраюць самыя дарагія людзі, пра якіх — хоць і разумееш, што гэта непазбежна, думаеш, што яны будуць заўсёды... І толькі россып зор на небе застаецца непарушным, і з году ў год у пэўны час у адным і тым жа месцы павісае над вуліцай поўня, і Вялікая Мядзведзіца абсалютна такая ж самая, як у дзяцінстве, калі ўпершыню зрабіў адкрыццё, што яна падобная... не, не на конаўку — на вялікі зорны плуг! Выйдзеш вось так увечары, пастаіш колькі хвілін пад гэтым чароўным вечкам — і знікаюць раптам горкія думкі, шматлікія сумненні, якіх з кожным годам не меншае, а наадварот. Можа, таму што бачыш над галавой гэткае немудрагелістае сведчанне таго, у што падсвядома верыш і на што ўпотай усё жыццё спадзяешся: ёсць у гэтым Сусвеце нешта, што не знікае без следу і назаўжды.

Вернуцца да Зямлі і Персеіды. Што б ні здарылася на гэтым блакітным шарыку, колькі б яго насельнікаў ні забіла адно аднаго, якія б паскудствы яны не вынайшлі — хвост каметы Свіфта — Татла ўсё роўна ў ноч з 12 на 13 жніўня абрыне на ўсіх, не разбіраючы, зорны дождж.

ДЗЕЛЯ чаго? Можа, проста дзеля таго, каб якому-небудзь стомленаму і разгубленаму чалавеку вельмі захацелася ўбачыць неба над бацькоўскай хатай і загадаць жаданне, якое абавязкова спраўдзіцца.

Алена ЛЯЎКОВІЧ

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

	30.06.2018 (неаудировано)	31.12.2017
Активы		
Денежные средства и их эквиваленты	488 494	720 387
Драгоценные металлы	358	504
Средства в кредитных организациях	61 225	59 207
Кредиты клиентам	2 617 333	2 586 356
Инвестиционные финансовые активы, переоцениваемые через прочий совокупный доход	502 064	537 413
Инвестиции в ассоциированные компании	3 982	3 891
Основные средства	141 673	147 372
Активы, построенные для продажи	3 919	7 848
Инвестиционная недвижимость	6 049	4 295
Нематериальные активы	41 813	36 096
Текущий актив по налогу на прибыль	34	2 757
Отложенные активы по налогу на прибыль	1 326	15 385
Прочие активы	30 839	31 906
Итого активы	**3 899 109**	**4 153 417**
Обязательства		
Средства кредитных организаций	917 064	1 050 670
Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь	20 026	5 009
Средства клиентов	2 117 558	2 341 774
Выпущенные долговые ценные бумаги	15 703	4 507
Текущие обязательства по налогу на прибыль	3 831	8 215
Отложенные обязательства по налогу на прибыль	868	988
Прочие обязательства	57 732	33 112
Субординированный кредит	206 921	199 340
Итого обязательства	**3 339 703**	**3 643 615**
Капитал		
Уставный капитал	473 057	473 057
Эмиссионный доход	458	458
Дополнительный капитал	5 485	5 485
Фонд переоценки зданий	22 637	22 771
Доходы по инвестиционным ценным бумагам, оцениваемым по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	10 186	16 606
Нераспределенная прибыль / (непокрытый убыток)	37 712	(17 756)
Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка	**549 535**	**500 621**
Неконтрольные доли участия	9 871	9 181
Итого капитал	**559 406**	**509 802**
Итого капитал и обязательства	**3 899 109**	**4 153 417**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Банк БелВЭБ»

за период, закончившийся 30 июня 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	За 6 месяцев, закончившихся 30.06.2018 (неаудировано)	За 6 месяцев, закончившихся 30.06.2017 (неаудировано)
Процентные доходы		
Кредиты клиентам	130 553	72 763
Инвестиционные финансовые активы	15 895	16 842
Средства в кредитных организациях	657	1 023
Финансовая аренда	21	29
	147 126	**90 657**
Процентные расходы		
Средства кредитных организаций	(21 348)	(20 475)
Средства клиентов	(31 565)	(23 526)
Субординированный кредит	(5 065)	(3 595)
Выпущенные долговые ценные бумаги	(389)	(99)
	(58 367)	**(47 695)**
Чистый процентный доход	**88 759**	**42 962**
Восстановление / (создание) резерва под обесценение активов, приносящих процентный доход	6 655	(25 161)
Убыток от модификации кредитов	(10 838)	-
Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты	(642)	(164)
Чистый процентный доход после резерва под обесценение	**83 934**	**17 637**
Чистые комиссионные доходы	**31 338**	**12 977**
Чистые доходы / (расходы) по операциям в иностранной валюте:		
– торговые операции	15 116	6 370
– операции с производными финансовыми инструментами	(28)	(200)
– переоценка валютных статей	(2 186)	(1 900)
Доля в чистом убытке ассоциированных компаний	(9)	(28)
Прочие доходы	17 150	7 987
Непроцентные доходы	**61 381**	**25 206**
Расходы на персонал	(31 955)	(15 129)
Амортизация	(11 767)	(6 084)
Налоги кроме налога на прибыль	(1 873)	(1 003)
Прочие операционные расходы	(30 034)	(13 740)
Создание прочих резервов и резервов под обесценение прочих активов	(2 645)	(158)
Непроцентные расходы	**(78 274)**	**(36 114)**
Прибыль до налога на прибыль	**67 041**	**6 729**
Налог на прибыль	(15 244)	3 673
Прибыль за отчетный период	**51 797**	**10 402**
Приходящаяся на:		
– акционеров Банка	51 107	9 963
– неконтрольные доли участия	690	439

И.о. Председателя Правления банка В.В. Полонский

Главный бухгалтер Л.А. Филиппова

10 августа 2018 г.

Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность, составленная в соответствии с требованиями МСФО, размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2018 год.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белэнергозащита», г. Минск, пер. Бехтерева, д. 7

Предмет аукциона
Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, в следующем составе:

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) (Здание специализированное автомобильного транспорта), в т. ч. дворовые сооружения	449,0 кв. м	500/С-51681
Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, д. 20А		
Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (материальный склад) (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)	22,1 кв. м	500/С-51680
Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, д. 20а		
Тепловая сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства)		500/С-1024935
Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, 20А (здание ул. Бехтерева, 20А/1) – здание (М))		

Сведения о земельном участке: пл. **0,2851** га, предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, здания специализированного автомобильного транспорта и дворовых сооружений по ул. Бехтерева, 20А, на праве постоянного пользования.

Ограничения (обременения прав): охранная зона тепловых сетей, площадь 0,0554 га, охранная зона подземных кабельных линий электропередачи, площадь 0,0487 га, охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0034 га

Начальная цена с НДС 20 % – 98 028,03 бел. руб. (снижена на 35 %)

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Задаток 10 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

В течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в г. «Звязда» 26.07.2018 г.

Аукцион состоится 13.09.2018 в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.09.2018 до 17.00 по** указанному адресу

Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. Email: auction@cpo.by

---

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133

Предмет аукциона
Местоположение – Минская обл., Смолевичский р-н, Пекалинский с/с

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (населенный пункт)
Лот № 1			
Здание магазина (здание магазина)	244,2 кв. м	614/С-18966	д. Заказинец, ул. Садовая, д. 72
Составные части и принадлежности: две холодные пристройки, сарай			
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. **0,2133** га для обслуживания магазина			
Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 41 000,00 бел.руб.			
Лот № 2			
Здание магазина (здание магазина)	254,3 кв. м	614/С-18945	д. Пекалин
Составные части и принадлежности: сарай, две холодные пристройки			
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды до 04.10.2065, общ. пл. 0,0804 га для обслуживания здания магазина № 52			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 49 200,00 бел. руб.			

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Гэта ў пачатку чэрвеня агучыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыла, прывёўшы ў прыклад Астравецкі і Ашмянскі раёны, дзе на сямі новых фермах з васьмі прадукцыйнасць статка ніжэй за сяроднерэспубліканскую (2071 кг). Нездавальняючай застаецца і якасць малака. За пяць месяцаў гэтага года ў 43 % даследаваных проб рэалізаванага сельгасарганізацыямі таго ж Ашмянскага раёна малака ўтрыманне саматычных клетак перавышала 500 тыс., у тым ліку ў 24 % проб — больш за 1 млн.

Намеснік міністра назваў тры прычыны няўдачы. Першая — новыя комплексы ўкамплектаваныя непрыдатнымі да новых умоў жывёламі (па фізіялагічных або прадукцыйных параметрах). Другая — дрэнная кармавая база, парушэнне тэхналогіі нарыхтоўкі і скормлівання кармоў (не хапае кормараздатчыкаў-змешвальнікаў). Трэцяя — недахоп спецыялістаў па рабоце з праграмным забеспячэннем па кіраванні статкам і вядзенні селекцыйнай работы.

Фота Надзеі БУЖАН.

Па сутнасці з чыноўнікам згодны і спецыяліст па харчаванні і ўтрыманні мясных і малочных жывёл кампаніі «Экамол Агра» Уладзімір Пярэднеў. Але ён расстаўляе акцэнты трошкі інакш: вінаваты не каровы, якія быццам бы аказаліся непрыдатныя да новых тэхналогій, а людзі, якія не стварылі для кароў умовы, спрыяльныя для выпрацоўкі малака. У тым ліку і на новых фермах.

— Усё вельмі проста, — кажа спецыяліст. — Для таго, каб карова дала малако, трэба яе накарміць, напаіць і даць ёй адпачыць лежма. Калі мы кажам, што ў нас кармоў дастаткова, то маем на ўвазе іх колькасць, а якасць не ацэньваем. Нашы гаспадаркі рапартуюць: нарыхтавалі сянаж першага класа, але каровы ядуць не клас, яны ядуць сухое рэчыва, якое вызначае ўдой малака.

Сучасная карова па памерах значна большая за сваю папярэдніцу мінулага стагоддзя, кажа Уладзімір Пярэднеў. Таму ёй трэба больш месца. І калі праблему харчавання мы вырашаем хоць бы колькасна, то пра мікраклімат і камфорт стойла, як правіла, не думаем. Разам з тым, у старых фермах каровам жыць немагчыма, у новых — цяжка. Мы сёння маем статак з кароў, прадукцыйнасць якіх павялічылася, але разам з тым, яны вельмі дрэнна асемяняюцца, колькасць хвароб узрасла. «Сёння любы спецыяліст малочнай жывёлагадоўлі, які працаваў у 90-я гады, скажа, што тады каровы не хварэлі, — заўважае эксперт. — Цяпер каровы масава хварэюць на мастыты, эндаметрыты, адбываецца іх невытворчае выбыццё. У 80-я, 90-я гады мы эшалонамі вазілі рамонтных цялушак у Казахстан, бо карова жыла пяць-восем гадоў, зараз — два-тры».

Спецыяліст звяртае ўвагу: калі карова на працягу ўсяго года змешчана пад дах, яна павінна штодня атрымліваць усе вітаміны і мінералы, якія яе продкі знаходзілі на дзікай пашы, тым больш што малака яна вырабляе больш. Незбалансаванасць рацыёну па энергіі, пратэіне, вітамінах і мінералах зніжае імунітэт буйной рагатай жывёлы. Але харчаванне — гэта яшчэ не ўсё.

«Як фізіёлаг магу сказаць, калі карова стаіць, яна трымае на нагах вельмі вялікую вагу, і асноўны працэс утварэння малака адбываецца толькі ў тым выпадку, калі карова ляжыць. Калі яна лягла, расслабілася, тады кроў цыркулюе праз вымя, туды паступае глюкоза, з яе атрымліваецца лактоза або ўдой малака, — тлумачыць Уладзімір Пярэднеў. — Калі карове не камфортна, яна знаходзіцца па-за стойлам і дае менш малака. У першыя два тыдні жніўня, калі стаяла спякота, колькасць выпрацаванага малака ў Беларусі зменшылася. Прычына — цеплавы стрэс, бо карова ў спякоту не жадае ляжаць, яна стаіць, не есць і страчвае ўдоі».

Уладзімір Пярэднеў лічыць, што сусветным узорам для пераймання перадавых тэхналогій у сферы малочнай жывёлагадоўлі можна лічыць Ізраіль. Там у аснове ўсяго — умовы для адпачынку жывёлы. Карова на працягу сутак павінна паляжаць 12—14 гадзін. Для гэтага неабходна не толькі прастора, але і само месца, куды жывёла можа легчы: яно павінна быць мяккае, чыстае, спрыяльнае для расслаблення. Да таго ж, важна, каб карова дыхала свежым паветрам. У Ізраілі дабіваюцца гэтага, хоць спякоту там не параўнаць з нашай.

Нягледзячы на тое, што даўно вядомыя аптымальныя памеры стойла для малочнай каровы, мы вечна змагаемся з праекціроўшчыкамі, выдумляем нешта сваё, эканомім, лічыць эксперт. «Какая карова будзе ляжаць на бетоне! — абураецца Уладзімір Пярэднеў. — А большасць стойлаў у нас, на жаль, бетонныя або пакрытыя гумай, што таксама няправільна. Варта перавесці карову на пясок, яна адразу дасць больш малака».

У нас ёсць гаспадаркі, якія імкнуцца да стварэння належных умоў для дойнага статка, і яны дабіваюцца адпаведных вынікаў, але іх не так ужо і шмат. На жаль, большасць — сярэдняга ўзроўню і ніжэй. Таму сярэдні паказчык прадукцыйнасці — пяць тысяч кілаграмаў. У Ізраілі на сярэдняй ферме карова дае 13—15 тысяч кілаграмаў малака. Пры гэтым у іх усе каровы асемяняюцца і без праблем жывуць не менш за чатыры лактацыі. Цікава, што ў Ізраілі вядучую ролю ў развіцці сельскай гаспадаркі выконвае менавіта дзяржава. Гэтым мы падобныя. Але там дзяржаўных патрабаванняў трымаюцца строга, а ў нас кожны імкнецца нешта зрабіць па-свойму, нешта выдумаць адмысловае.

Яшчэ адзін складнік поспеху — якасны менеджмент. У 2006 годзе ў Іспаніі было праведзена вельмі цікавае даследаванне: кароў на амаль чатырох тысячах фермаў кармілі аднолькавым кормам, але надоі там адрозніваліся на 13 літраў. Бо фактары менеджменту (нарошчванне маладняку, якасць і агульная арганізацыя кармлення, камфорт кароў) з'яўляюцца вызначальнымі.

Сучасныя комплексы ў птушкаводстве і свінагадоўлі, у адрозненне ад малочнатаварных, сапраўды прывялі да ўзлёту ўсіх паказчыкаў, сусветнага узроўню вытворчасці і якасці. Але з буйной рагатай жывёлай вынік не такі станоўчы, бо для гэтых жывёл большае значэнне мае чалавек, лічыць Пярэднеў. Дастаткова аднаму работніку на ферме дрэнна выконваць свае абавязкі, скажам, механізатар кепска змешвае корм, і гэта адаб'ецца на якасці ўсяго статка. «Прасцейшая сітуацыя з вырошчваннем маладняку, — кажа эксперт. — У нас з'явілася з дзясятак прадпрыемстваў па вырошчванні рамонтнага маладняку, і там няма розніцы з агульнаеўрапейскімі паказчыкамі».

Спецыяліст па кармленні і ўтрыманні мясных і малочных жывёл не баіцца паўтараць: «У аснове ўсяго павінна ляжаць дыктатура тэхналогій. Яны даўно распрацаваныя ў краінах з высокаэфектыўнай малочнай жывёлагадоўляй: ЗША, Ізраілі, Галандыі, Італіі, Новай Зеландыі. Неабходна пастаяннае навучанне спецыялістаў азам. Чалавек на ферме павінен ведаць, перш за ўсё, чаго рабіць нельга. Калі мы падымем узровень прафесійнай адукацыі, мы дасягнем поспеху».

Уладзімір Пярэднеў упэўнены: пры стварэнні для каровы «чалавечых» умоў, вынік гарантаваны ўжо на наступны дзень. Літаральна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

МАЛАКО НА ПАПЕРЫ

вылілася ў крымінальную справу

У дачыненні да шасці службовых асоб ААТ «Чырвоная Буда» Добрушскага раёна пракуратурай Гомельскай вобласці заведзена крымінальная справа. Яна стала вынікам праверкі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці і ўпраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці.

У прэс-службе паведамілі, што на пачатку лета падчас інвентарызацыі ў гаспадарцы выкрыты прыпіскі прыбаўленняў у вазе буйной рагатай жывёлы. На 1 чэрвеня было прыпісана звыш 780 тон — гэта больш за 26 % ад агульнай вагі жывёлы. Аналагічна службовыя асобы завышалі аб'ёмы вытворчасці і рэалізацыі малака. Таксама шляхам скажэння справаздачнасці кіраўніцтва гаспадаркі вырашыла задачу па павелічэнні прадукцыйнасці кароў. Фактычнае пагалоўе дойнага статка заніжалася: больш за 500 кароў даіліся, але лічыліся ў групе адкорму. У выніку сярэдні надой на карову быў значна завышаны.

Гэтыя прыпіскі дазволілі кіраўніку сельгаспрадпрыемства адчытацца пра перавыкананне даведзеных на 2017 год прагнозных паказчыкаў росту вытворчасці мяса і малака. Аднак такі «рост вытворчасці» не прывёў ні да фінансавай стабільнасці, ні да павелічэння заработнай платы. Між іншым, тым галоўным спецыялістам, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў скажэнні справаздачнасці, надбаўкі і даплаты за фіктыўнае выкананне прагнозных паказчыкаў выплачваліся рэгулярна. Іх сума склала больш за Br25 тысяч.

Былі выкрыты таксама факты прычынення шкоды ААТ «Чырвоная Буда». Напрыклад, дзяржаўнымі кантралёрамі выяўлена нястача больш як 200 галоў скаціны на суму каля Br205 тысяч. У лясным масіве побач з фермай знойдзены дзесяць трупаў цялят, якія былі закапаныя ўпотай без афармлення неабходных дакументаў. Акрамя таго, у гаспадарцы летась і сёлета рэалізавалі больш за 13 тон мяса буйной рагатай жывёлы фізічным асобам па цэнах, ніжэйшых за сабекошт. Гэта прыводзіла да прычынення прадпрыемству страт у суме больш за Br40 тысяч.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВЯСКОВЫ БІЗНЕС

Як фермер з Гродзенскага раёна забяспечвае збор малака ад насельніцтва

Аляксандр ЗУБРЫЦКІ не толькі сам актыўна здае малако на прыёмны пункт, але і збірае яго ў жыхароў навакольных вёсак. Штодзень ён адвозіць на прыёмны пункт да 600 літраў.

— У нас 23 здатчыкі па калгасе, — расказвае Аляксандр Зубрыцкі, — я забіраю малако з самага ранку і вязу ў найбліжэйшы населены пункт — пасёлак Сапоцкін. Людзі задаволеныя, бо гэта выгадна, і малака здаём нямала.

— Канешне, гэта добрая дапамога для сямейнага бюджэту, па сутнасці, мы з гэтага і жывём. Што атрымалі за малако, тое і маем, — кажа Аляксандр.

Першую кароўку сям'я набыла 11 гадоў таму. Аляксандр звольніўся са службы і задумаўся аб сваёй гаспадарцы. Да таго ж у сям'і падраслі чатыры дачкі. А малако для дзяцей, як вядома, — асноўны прадукт харчавання. Калі першая карова ацялілася, купілі яшчэ адну. Паступова

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

нарошчвалі статак, а некалькі гадоў таму ім выдзелілі 25 гектараў зямлі пад фермерскую гаспадарку.

— Справа ў тым, што не хапала кармоў. Участкі для выпасу не маглі забяспечыць патрэбу для такога статка, — растлумачыў Аляксандр. — Таму звярнуўся ў калгас, каб атрымаць зямлю для нарыхтоўкі кармоў і афарміў фермерскую гаспадарку.

Усе жывёлы, у адрозненне ад калгасных, пасуцца на пашы. Аляксандр свой статак утрымлівае ў памяшканні толькі ў халодны перыяд. Затое каровы не маюць праблем з капытамі, як большасць калгасных, а дояцца не менш за 10 гадоў. Гэта станоўча ўплывае на развіццё ўласнай гаспадаркі.

— На дамашнія малочныя прадукты ёсць попыт нават сярод вяскоўцаў, — кажа Аляксандр, — мы для сябе вырабляем і тварог, і масла, і смятану. Маглі б таксама прадаваць, але не паспяваем вырабляць такія аб'ёмы, бо ў саміх вялікая сям'я. Некаторыя жыхары трымаюць кароў толькі для сябе і прадаюць малако сваім суседзям.

На пачатак года ў Падлабенскім сельсавеце зарэгістравана 115 дойных жывёл. Гэта нямала. Згодна з чыпаваннем, колькасць дойнага статку не змяншаецца. Наадварот, некаторыя жыхары набылі цялят і збіраюцца іх гадаваць. За мінулы год насельніцтвам здадзена 21 тона малака ад 23 здатчыкаў.

Ці захаваецца такое становішча налета, Аляксандр сумняваецца. Ён паведаміў, што найбліжэйшы прыёмны пункт у пасёлку Сапоцкін можа быць закрыты ў сувязі з развіццём турыстычнай інфраструктуры, у прыватнасці, будаўніцтвам стаянкі веламаршруту. Тады прыйдзецца вазіць малако ў больш аддалены сельсавет, які знаходзіцца за 50 кіламетраў. Аляксандр лічыць, што ў спякоту вельмі складана забяспечыць на такой адлегласці якасць малака, яно можа падкіснуць. Такая сітуацыя непакоіць і гаспадароў, якія трымаюць некалькі кароў і прывыклі да ўстаноўленага парадку.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

КАМПЕТЭНТНА

Мы спыталі, чаго чакаць вяскоўцам ад гэтай сітуацыі ў **старшыні Сапоцкінскага пасялковага Савета Ліліі ШАМАТОВІЧ,** якая паведаміла, што прыёмны пункт закрывацца ні ў якім разе не будзе.

— У раёне распрацоўваецца праект па будаўніцтве веладарожкі і стаянкі. Праз Сапоцкін пралягае адзін з міжнародных веламаршрутаў, які павінен злучыць Гродна з Аўгустоўскім каналам. Але гэта ніякім чынам не паўплывае на здачу малака. Прыёмны пункт працуе ў асобным будынку, дзе раней быў сепаратарны цэх. Ніхто яго закрываць не збіраецца. Веламаршрут і стаянка не будуць ніякім чынам закранаць ні прыватныя ўчасткі, ні землі сельсавета. Малако тут будуць прымаць, як і прымалі.

Раней Аляксандр вазіў толькі сваю прадукцыю. Сям'я Зубрыцкіх з вёскі Рацічы трымае ажно 12 кароў і здае да 100 літраў у дзень. У мясцовым калгасе «Ніва-2003» прапанавалі аформіць яшчэ і збор малака ад насельніцтва. І вось ужо трэці год Аляксандр на сваім «бусе» штодзень курсіруе па вёсках, каб забраць лішкі малака ў іншых. І калгасу такі расклад выгадны, бо не трэба задзейнічаць транспартны сродак, кіроўцу і грузчыка, што для сельгаспрадпрыемства даволі дорага.

Для многіх вяскоўцаў магчымасць здаваць лішкі — адна з умоў утрымання статка. На гэтым можна нядрэнна зарабіць. Вынік ацэньваецца па тлушчы. Чым яго больш, тым і кошт вышэйшы. Напрыклад, за літр малака тлушчам не менш 3,6 % атрымліваецца 51 капейка. Разлік — кожныя дзесяць дзён. За месяц можна зарабіць адну, а то і дзве вясковыя зарплаты. На гэты прадукт зрабіў стаўку і фермер Аляксандр Зубрыцкі.

ГРУПЫ І СТАЎКА

Карэспандэнт «МС» паспрабавала разабрацца, калі на Магілёўшчыне павысяцца надоі

Яшчэ летась падчас рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў завяршыць будаўніцтва малочнатаварных фермаў у краіне за 2017—2018 гады. Ён падкрэсліў, што пабудаваныя фермы павінны быць запоўненыя высакаўдойным статкам. І адзначыў важнасць пытання захаванасці кармоў. Мы паспрабавалі прааналізаваць, як усё гэта выконваецца на прыкладзе Магілёўскай вобласці.

Дрэнныя кармы і чалавечы фактар

Летась КДК Магілёўскай вобласці правёў праверку ходу мадэрнізацыі МТФ і прыйшоў да высновы, што не ўсё робіцца для таго, каб квітнела малочная галіна. Сваімі меркаваннямі кантралёры падзяліліся са спецыялістамі. І зараз вядзецца маніторынг, што адбываецца на стратэгічна важных для беларускай эканомікі аб'ектах.

— Па праграме развіцця малочнай галіны трэба пабудаваць або мадэрнізаваць у вобласці 170 малочнатаварных фермаў, — кажа **Аляксандр ЗНОСІНКА, намеснік начальніка ўпраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці.** — Па нашых звестках, цалкам узведзены 140 фермаў, яшчэ на 30 работы не завершаны. Галоўная прычына — праблемы з фінансаваннем. Але ўсе 170 фермаў працуюць. Розніца толькі ў тым, што 30 з іх працуюць не на поўную магутнасць. Мясцовыя ўлады прымаюць меры па пошуку сродкаў для рашэння праблемы. Бо гаспадаркі нясуць страты ад недаўкамплектацыі. Умоўна кажучы, калі ферма разлічана на 800 галоў, а там усяго 400 — гэта дрэнна.

Пакуль мэта, для якой праводзілася мадэрнізацыя — рост якасці і аб'ёмаў малака — не спраўдзілася. Па словах Аляксандра Зносінкі, удой на карову за паўгода па 265 МТФ склаў 2113 кілаграмаў. Летась сярэдні ўдой на карову на сучасных комплексах быў на 83 кілаграмы большы. Па вобласці сярэдні ўдой — 2078 кілаграмаў за паўгода таксама знізіўся на 80 кілаграмаў.

— Асноўныя прычыны — гэта недахоп кармоў і хваробы, — кажа суразмоўнік. — Малако — гэта ж тыя самыя кармы, іх якасць. Шмат гаспадарак, якія мы наведвалі, практычна не давалі жывёлам камбікармы або колькасць іх у рацыёне кароў была нязначная. Безадказнасць, адным словам. Не ажыццяўляецца своечасовая выбракоўка кароў, пра што казаў Прэзідэнт. Адна дае больш малака, другая менш. Агульны вынік кульгае. Ёсць гаспадаркі, дзе за паўгода ад адной каровы надаілі ўсяго 479 літраў малака. Гэта ненармальна. Наш кантроль заключаецца ў тым, каб па максімуме дапамагчы гаспадаркам дабіцца лепшых вынікаў. Трэба іх падштурхоўваць. Ёсць даручэнне Прэзідэнта, і яно павінна выконвацца. МТФ будуюцца для таго, каб калгасы зараблялі рэальныя грошы. Гэта іх круглагадовы прыбытак. Мы не так даўно аналізавалі: у 2017 годзе рэнтабельнасць продажу малака склала 24 %. Трэба даглядаць жывёлу, каб яна давала малако. Непрадукцыйнымі жывёлы становяцца таму, што да іх няма належнай увагі.

> Нядаўна па даручэнні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама на прадпрыемстве была створана група, якая працуе над якасцю малака і аказвае сельскагаспадарчым арганізацыям тэхналагічную і метадычную дапамогу.

Адмысловая група часта пачынае работу а 3-й гадзіне

Падчас нядаўняй сустрэчы з працоўным калектывам холдынга «Бабуліна крынка» **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай СНАПКОЎ** звярнуў увагу на тое, што трэба развіваць сыравінную базу, удзяляць пільную ўвагу ўзнаўленню малочнага статка і выпуску якаснага малака. Толькі гэта, на яго погляд, забяспечыць якасны рост вытворчасці малака.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Тэлесеткі

УСЯ СОЛЬ ЮБІЛЕЮ

Як нараджаўся адзін з самых маладых гарадоў Беларусі і які быў шлях ад першай буравой вышкі да прамысловага цэнтра з самай высокай у Еўропе шчыльнасцю насельніцтва? Дакументальны фільм «Горад салёнага золата», зняты Агенцтвам тэлеінвестыцый спецыяльна да 60-годдзя Салігорска, тэлеканал «Беларусь 1» пакажа ўвечары 23 жніўня.

Аўтар праекта Алеся Высоцкая расказала, што здымачнай групе дзеля эксклюзіўных кадраў і развянчання некаторых міфаў пра Салігорск давялося не толькі спусціцца ў шахту, але і падняцца на самыя высокія тэрыконы — штучныя насыпы з пустых парод — і ўбачыць амаль што марсіянскія пейзажы... Акрамя таго, журналісты адшукалі рэдкія кадры хронікі — запісы інтэрв'ю з першымі будаўнікамі і шахцёрамі, што стаялі ля вытокаў стварэння горада.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона	
Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Продавец	ООО «Алакарт-Дизайн», г. Минск, ул. Мясникова, д. 34, комн. 10

Предмет аукциона

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Торговое помещение	405,9 кв. м	500/D-683477	г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 50, корп. 1, пом. 1Н

Начальная цена с НДС 20 % – 1 092 277,00 бел. руб.

Задаток 2 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения победителем торгов за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**20.09.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**18.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@ipmconsult.by. Интернет сайт www.cpo.by

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 50

У нашага клуба — міні-юбілей. А вось гомельскі шахматны кампазітар Віктар Зайцаў да свайго юбілею, 50-годдзя, правёў буйны міжнародны конкурс складання, на які паступіла 247 задач 103 аўтараў з 17 краін. Суддзя-юбіляр адзначыў 65 твораў.

У раздзеле двухходовак змагалася 31 задача 27 аўтараў. Прызы размеркаваліся так: I — Васіль Дзячук (Украіна), Павел Мурашоў, Анатоль Слесарэнка (Расія); II — Міхаіл Храмцэвіч (Беларусь); III — Часлаў Якубоўскі (Беларусь); IV — Валерый Шаньшын (Расія). Ганаровыя водгукі: I — Павел Мурашоў (Расія); II — Мірка Дэгенколбе, Уда Дэгенер (Германія); III — Гіві Масіяшвілі (Грузія). Пахвальныя водгукі: I — Рыгор Атаянц (Расія); II — Аляксандр Феакцістаў (Расія); III — Аляксандр Панкрацьеў (Расія); спецыяльны за мініяцюру — Эльмар Абдулаеў (Азербайджан).

Вось задача ***(гл. дыяграму)***, якая атрымала першы прыз.

Белыя: Kph1, Фс8, Лd7, Лg1, Cd8, Cg2, Ke6, Kg5, пп. d4, e3, h2 (11).

Чорныя: Kpf5, Фа2, Ла8, Лf6, Сс2, Ка6, пп. b2, e4, f4, g4, g6 (11).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

Задачы на мат у 4—8 хадоў былі прадстаўлены 39 творамі 29 аўтараў. Прызы: I — Яўген Фамічоў (Расія); II — Аляксандр Булаўка, Віктар Волчак (Беларусь). Ганаровыя водгукі: I — Леанід Любашэўскі, Леанід Макаронец (Ізраіль), Віктар Волчак (Беларусь); II — Аляксандр Панкрацьеў (Расія); III — Аляксандр Сыгураў (Расія). Пахвальныя водгукі: I — Міхаіл Костылеў (Расія); II — Міхаіл Храмцэвіч, Віктар Волчак (Беларусь); III — Ар'е Грынблат (Ізраіль).

* * *

Уладзіслаў Кавалёў заняў трэцяе месца на прэстыжным турніры ў германскім Дортмундзе. Калі б у апошнім туры ён адолеў славутага экс-чэмпіёна свету Уладзіміра Крамніка, мог бы і выйграць турнір. А вось як наш суайчыннік перайграў гросмайстра з Нідэрландаў.

Аніш Гіры — Уладзіслаў Кавалёў. 1. e4 c5 2. Kf3 Kf6 3. e5 Kd5 4. Kc3 e6 5. K:d5 ed 6. d4 Kc6 7. c3 cd 8. K:d4 d6 9. Cb5 Cd7 10. ed C:d6 11. 0-0 0-0 12. Kb3 a6 13. Ce2 Фс7 14. h3 Лfe8 15. Ле1 Ле5 16. Се3 Лае8 17. Cd3 g6 18.Фd2 Фd8 19. Kd4 K:d4 20. C:d4 Л:e1+ 21. Л:e1 Л:e1+ 22. Ф:e1 Фе8 23. Фd2 Се5 24. Се3 Фе6 25. f4 Cf6 26. a3 h5 27. Сс2 Сс6 28. Cf2 Фе7 29. Cd1 Фе6 30. Сс2 Фе7 31. Cb6 Фе6 32. Фf2 Фе8 33. Фd2 Фе6 34. Сс5 Фе8 35. Фd1 d4 36. Фd2 dc 37. bc Фе6 38. Cd4 C:d4+ 39. cd Фа2 40. Фс3 Фd5 41. Фd2 Фа2 42. Фс3 h4 43. Kph1 a5 44. a4 Фd5 45. Фd2 b6 46. f5 Kpg7 47. fg fg 48. Cd1 Фf5 49. Kpg1 Cd5 50. Сс2 Фf6 51. Фе3 g5 52. Cd3 Kph6 53. Сс2 Kpg7 54. Cd3 Kph6 55. Сс2 Фf4 56. Фd3 Kpg7 57. Фg6+ Kpf8 58. Фd3 Kpg7 59. Фg6+ Kpf8 60. Фd3 Kpe7 61. Cd1 Фе4 62. Фd2 Kpd6 63. Сс2 Фf4 64. Фd3 Kpc7 65. Фh7+ Kpb8 66. Фd3 g4 67. hg Ф:g4 68. Фg6 Ф:d4+ 69. Kph1 Cb7 70. Фе8+ Kpa7 71. Cf5 Фd1+ 72. Kph2 Фd6+ 73. Kph1 Фg3, 0:1.

* * *

На юнацкім чэмпіянаце Еўропы па хуткіх шахматах у Румыніі заваявалі «золата»: Арцём Бяляўскі — у групе да 10 гадоў, Дзяніс Лазавік — да 12, Максім Царук — да 14, а Міхаіл Спіжарны — «серабро» да 12. Няблага выступілі Сяргей Барышчык (4-е месца да 10 гадоў), Арцём Стрыбук, Ягор Сіліч, Арцём Сіняўскі (адпаведна 5-е, 6-е і 7-е месцы да 12 гадоў), Вячаслаў Зарубіцкі (5-е месца да 16 гадоў). У камандным турніры да 12 гадоў дзве беларускія зборныя выйгралі «золата» і «серабро», а да 18 гадоў Беларусь — чацвёртая з 24. У бліцы Арцём Бяляўскі ўзяў «серабро» да 10 гадоў.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фа8. Першымі правільна адказалі Аляксандр Сямерыч, Віктар Жук, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

■ Сядзі і глядзі

ВАНДРОЎКІ ДАЛЁКІЯ І БЛІЗКІЯ

«Таямніцы Бургундскага двара»
«МІР», 26 жніўня

Высакародны рыцар граф дэ Нэвіль закаханы ў Жанну дэ Бавэ, хрэсніцу караля Людовіка XI. Але манарх з палітычных меркаванняў жадае выдаць дзяўчыну замуж за герцага Бургундскага. Той выкрадае Жанну, але дэ Нэвіль пад выглядам вадроўнага музыкі прабіраецца ў замак і вызваляе яе. І толькі тут даведваецца, што змагацца давядзецца не толькі за асабістае шчасце, але і за захаванне каралеўскага трона, з якога Людовіка плануе скінуць каварны герцаг...

«Прыправы і страсці»
«Беларусь 2», 25 жніўня

Індыйскія эмігранты прыехалі ў правінцыйны французскі гарадок і вырашылі адкрыць кафэ з усходняй кухняй. Але насупраць — французскі рэстаран, гаспадыня якога мадам Малары ганарыцца нацыянальнымі кулінарнымі традыцыямі і тым, што мае зорку «Мішлен». Барацьба кухняў за кліентуру пагражае перарасці ў адкрытую вайну, калі высвятляецца, што кухар-эмігрант Хасан мае бездакорны густ і лёгка спраўляецца з самымі вытанчанымі французскімі рэцэптамі...

«Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі»
«Кінакамедыя», 20—25 жніўня

Кар'ера вядомага ў мінулым тэлевядучага Дэна Джэральда ляціць пад адхон, і выратаваць яе можа хіба сенсацыя. У пошуках такой журналіст адпраўляецца ў выдуманую краіну Паломбію, дзе жыве надзвычай рэдкая і загадкавая істота — рыжы даўгахвосты сумчаты Марсупіламі, нейкім чынам звязаны з сакрэтам вечнай маладосці. Магчыма, таму на жывёлку палююць вучоныя, вайскоўцы, браканьеры і шмат хто яшчэ, і вось пытанне — хто дабярэцца да Марсупіламі першым?

«Марс»
АНТ, 26 жніўня

Кожнаму хоць аднойчы хочацца кінуць усё і збегчы на ўсе чатыры бакі. Вось і вядомы баксёр Барыс, які не прайграў ніводнага бою, аднойчы настолькі расчараваўся ў жыцці, што сеў у цягнік і паехаў у невядомым напрамку. Вярнуўся ў прытомнасць герой на станцыі «Мар...с» — у правінцыйным гарадку, дзе жыве дзяўчына з самай доўгай касой у Расіі, усе гараджане працуюць на фабрыцы мяккіх цацак, а жыццё настолькі нагадвае сон, што міжволі адчуеш сябе на іншай планеце.

«Людзі на балоце. Палеская хроніка»
«Беларусь 3», 21 жніўня

20-я гады мінулага стагоддзя, савецкая ўлада дайшла ўжо і да палескіх балот. Заможныя сяляне з вёскі Курані не хочуць аддаваць свае надзелы галоце, аднак сялянскі сход вырашае, што трэба змяняць становішча да лепшага: рабіць грэблю, каб звязаць Курані з вялікім светам, і перамяраць зямлю. Ды толькі не для ўсіх новае жыццё аказалася шчасным: сялянка Ганна Чарнушка, пакрыўджаная сваім каханым, мясцовым хлопцам Васілём, насуперак уласным пачуццям выйшла замуж за Яўхіма, сына куранёўскага кулака...

■ Запрашальнік

Талачын адзначыць 585-годдзе

Усіх ахвотных запрашаюць прыняць удзел у святкаванні, што пройдзе ў суботу, 18 жніўня.

Тэатралізаванае шэсце стартуе ад аўтастанцыі а 10-й гадзіне раніцы і фінішуе на плошчы 40 год Кастрычніка.

У гарадскім скверы па вуліцы Леніна размесціцца «Горад майстроў», можна будзе пачаставацца прадукцыяй «Чырвонага харчавіка».

На адкрытай канцэртнай пляцоўцы гасцей чакае выстаўка рэтра-аўтамабіляў, ушананне працоўных дынастый, ганаровых грамадзян раёна, канцэрт артыстаў са сталіцы і Брэста.

Завершыцца свята фаер-шоу, феерверкам і дыскатэкай.

Свята тамата

У суботу, 18 жніўня, Іўе запрашае ўсіх ахвотных на яркае, вясёлае і смачнае свята «Іўеўскі памідор».

Удзельнікаў чакае бітва таматнымі... фарбамі, касцюміраванае шэсце, конкурсы на самую лепшую страву з памідораў, конкурс адмысловых агародных пудзіл. Упершыню будуць праводзіць конкурс на самы вялікі тамат «Сіньёр Памідор» сярод гаспадароў Іўеўскага раёна.

Усе ахвотныя змогуць пакаштаваць «памідорны бутэрброд» вялікага памеру, купіць таматы на выстаўцы-продажы, навучыцца рабіць тэматычныя сувеніры, палётаць на дэльтаплане.

Свята завершыцца запускам у неба галоўнага сімвала — паветранага памідора.

Дарэчы, тут будуць вітацца чырвоныя і жоўтыя колеры ў адзежы.

Пачатак а 12-й гадзіне

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». (16+).
9.10 «Галоўны эфір».
10.20, 12.10, 18.45, 19.20 Серыял «Добры хлопец». (16+).
12.50, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Каханне не дзеліцца на 2». (12+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
18.15 «Лёс гігантаў».
21.00 «Панарама».
21.45 Спецыяльны рэпартаж (12+).
22.10 Серыял «След» (16+).
0.20 «Арэна».
1.00 «Дзень спорту».

Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 18.30, 22.10 «Тэлебарометр».
9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.40 «Капейка ў капейку» (12+).
11.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
11.55 «Спатканне для мамы» (12+).
13.00 «Свет навыварат. Японія» (16+).
13.55 М/с «Качыныя гісторыі» (0+).
14.45 Анімацыйны фільм «Прыгоды імператара» (0+).
16.05 Фэнтэзі «Хронікі Нарніі: прынц Каспіян» (12+).
19.15 «Суперлато».
21.05 «Паненка-сялянка» (16+).
22.05 «КЕНО».
22.15 «Улюбёнцы». Серыял (16+).
23.20 «Ідзі сюды і танцуй».
23.25 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).
0.05 «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Рагойш.
8.05, 12.00, 19.55 Навіны культуры.
8.20, 12.15 Гэты дзень.
8.30 «Нацыянальны хіт-парад».
9.25, 17.25 «Апошні дзень». Вячаслаў Ціханаў (12+).
10.00 «Навукаманія» (6+).
10.30 «Вячэра з прыдуркам». Камедыя (12+).
12.50 «Наперад у мінулае».
13.20, 21.05 «Руіны страляюць...» Маст. фільм (12+).
14.20, 22.15 «Вызваленне». «Яса-Кішынёўская наступальная аперацыя» (12+).
14.45 «Я — Хорціца». Драма (12+).
15.55, 22.35 «На спіне ў чорнага ката». Камедыя (12+).
17.25 «Апошні дзень». Вячаслаў Ціханаў (12+).
18.00 «Ляон». Драма (16+).
20.10 «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Аляксандр Касцючэнка.
20.40 «Калыханка» (0+).

Беларусь 5

6.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Хадэрсфілд».
8.50 Вынікі тыдня.
9.35 Мастацкая гімнастыка. Чэлендж-кап. Мінск. Гала-шоу.
10.40 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Кваліфікацыя. Мужчыны. Беларусь — Іспанія.
12.40 Дзюдо. Еўрапейскі турнір. Мінск.
13.40 Піт-стоп.
14.10 Тэніс. WTA. Цынцынаці. Фінал.
15.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Брайтан» — «Манчэстэр Юнайтэд».
17.50 Хакей. Кубак Беларусі. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
20.15 Час футбола.
21.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
21.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлэс» — «Ліверпуль». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 «Контуры».
10.00 «Жыць здорава!» (12+).
11.10 «Кантрольная закупка» (12+).
11.50 «Модны прыгавор» (12+).
13.10 Серыял «Блізняты» (12+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+).
16.20, 0.05 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.30, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
19.00 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 Серыял «Шпік» (12+).
23.05 Серыял «Чырвоныя бранзалеты» (12+).
1.00 «Начныя навіны».

СТБ

5.30 «Вялікі горад».
6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
6.10, 20.15 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 19.55, 23.00 «СТБ-спорт».
9.05 «Скардзіцца дазваляецца».
9.25 «Тыдзень».
10.40, 20.25 «Водбліскі». Серыял (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 23.55 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
14.40, 22.10 «Глядзець усім!» (16+).
15.00, 16.50 «Ежа багоў» (16+).
17.00 «Энігма». Серыял (16+).
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
23.05 «Загадкі чалавецтва» (16+).
0.35 «Мінтранс» (16+).
1.20 Фантастыка «Пятля часу». (18+).

МІР

6.00 Серыял «Знак шчырага шляху». (16+).
9.00, 1.25 «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
10.05, 13.15 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-3». (16+).
14.00, 2.25 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.00 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 0.25 «Гульня ў кіно» (12+).
17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).
19.20, 3.50 Серыял «Кодэкс гонару». (16+).
22.05 Маст. фільм «Псіхапатка» (16+).
3.25 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 Маст. фільм «Мільянер». (16+).
13.35 Пакой смеху.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
15.45 «60 хвілін». Ток-шоу.
17.35 «Лёс чалавека». (12+).
18.45 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
20.40 Серыял «Спакушэнне». (12+).
22.45, 23.10 Серыял «Маскоўская барзая». (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.40 Сёння.
6.10 «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
7.10, 8.10, 10.25 Дэтэктыў «Смяротны танец». (16+).
12.00 «Чакай мяне». (12+).
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.05 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).
16.35 Серыял «Бой з ценем». (16+).
19.45 Серыял «Марскія д'яблы». (16+).
21.25 Серыял «Шэлест. Вялікі перадзел». (16+).
23.15 «НЗ.by».
23.50 Серыял «Сведкі». (16+).

8 канал

7.00, 15.55, 19.15, 21.00, 0.55 «Надвор'е».
7.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
7.15, 0.05 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
8.10 Серыял «Цяжкі пясок» (16+).
9.10, 19.20 Серыял «Сям'я» (16+).
10.10 «Здароўе».
11.00, 17.45 Серыял «Сакратар» (16+).
12.30 Драма «Сланечнікі» (16+).
14.25 «Героі коміксаў на экране». Камедыя «Дзеці шпіёнаў» (12+).
16.00 «Мультпарад» (0+).
16.10 Дак. фільм «Малышы» (0+).
16.50 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.05 Драма «Тайна Крыклі-хола» (16+).

ВТБ

6.00 «Турбаміксер» (16+).
7.00 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
7.40, 0.00 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
9.00, 3.00 М/ф «Марын і яго сябры» (0+)
9.30, 3.25 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+)
9.50, 2.10 «Ералаш» (6+).
10.20, 18.50 «Уральскія пельмені» (16+).
11.30 «Проста кухня» (16+).
12.00 «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
13.00 Серыял «Беглыя сваякі» (16+).
15.10 Баявік «Аднойчы ў Мексіцы: адчайны-2» (16+).
17.10 Анімацыйны фільм «Рэальная вавёрка» (0+).
21.00 Серыял «Новы чалавек» (16+).
23.00 Серыял «Мільёны ў сетцы» (16+).
2.10 «Вакол свету падчас дэкрэта» (12+).
3.40 «Лаві момант» (16+).
5.00 «Дурні і дарогі» (16+).

Культура

6.30 «Твар на мішэні». Маст. фільм.
8.55 М/ф «Кракадзіл Гена», «Чабурашка», «Шапакляк», «Чабурашка ідзе ў школу».
10.05 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Кін-дза-дза!» Маст. фільм.
12.45 «Ахен — трэці Рым, або Першая спроба аб'яднання Еўропы».
13.10 «Жыццё ў паветры». Дак. серыял.
14.00 Пласіда Дамінга. Канцэрт у Ларэлее.
15.35 «Басаногая графіня». Маст. фільм.
17.40, 1.55 «Туарэгі, воіны ў дзюнах». Дак. фільм.
18.35 «Пешшу...» Калуга манументальная.
19.05 «Шукальнікі». «Тайна горнага аэрадрома».
19.50 «Рамантыка рамансаў».
20.45 Да 95-годдзя з дня нараджэння Юлія Карасіка. «Шклянка вады». Маст. фільм.
22.55 Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Арэлі Дзюпон і Раберта Бале ў балеце Ж. Маснэ «Гісторыя Манон». Пастаноўка Парыжскай нацыянальнай оперы.
1.10 Каханне ў мастацтве. «Сальвадор Далі і Гала Элюар». Дак. фільм.
2.45 «Цяпі, Ляп — маляры!» М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1968. 2-я частка. (12+).
7.00, 8.15, 9.45, 11.00, 17.20, 19.25, 20.15, 3.45, 5.00 Настальгія (12+).
7.20 Дак. фільм «Мае сучаснікі». (12+).
8.50 М/ф «Казка для Наташы». (6+).
9.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00 «Колба часу» (16+).
12.00 «Сустрэча ў канцэртнай студыі «Астанкіна» з Андрэем Мироновым». 1978 год (12+).
13.45 Фільм-канцэрт «Вас запрашае Сафія Ратару». 1985 год (12+).
15.00 «Быў час». 2009 год (16+).
16.00 Тэлефільм «Ваша дачка, Аляксандра...» (16+).
18.00 «Пад знакам задыяка. Дзева». 1992 год (12+).
19.40 «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Праблемы сямейнага і халасцяцкага жыцця». 1992 год (16+).
20.45 Маст. фільм «Позняе каханне». (16+).
23.15 «У гасцях у М. Магамаева». Фрэнк Сінатра. 1992 год (16+).
0.00 Маст. фільм «Звычайная гісторыя». (16+).
2.15 Фільм-канцэрт «Бенефіс Савелія Крамарава». 1974 год (12+).
4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
5.15 «У гасцях у М. Магамаева». Лайза Мінэлі. 1992 год (16+).

EuroSport 1

4.00, 9.30, 19.00, 22.00, 1.30 Веласпорт. «Тур Германіі».
5.00, 8.00, 11.30, 15.45, 20.00 Скачкі з трамплінa. Летні Гран-пры.
6.00 Watts.
7.00, 10.30, 17.00, 21.00, 0.30 Веласпорт. «Вуэльта».
12.45 Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.
13.45 Веласпорт. «Тур дэ л'Авенір».
18.50 Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
23.00 Конны спорт.
0.00 Ралі. ERC.

Кінакамедыя

1.15 Нягледзячы ні на што. (16+).
3.30 Скандынаўскі фарсаж. (16+).
5.20 Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе. (16+).
7.10 Каханне прэт-а-портэ. (12+).
8.50 Даю год. (16+).
10.40 Супер Брыс. (12+).
12.20 Любоў-маркоў па-французску. (18+).
14.00 Васабі. (16+).

15.45 Аднакласніцы: легенда пра золата Фрытана. (16+).
17.45 Выкідала. (18+).
19.30 Статус: свабодны. (16+).
21.20 Кахае — не кахае. (16+).
23.00 Па версіі Барні. (16+).

ТБ3

6.00 М/ф (6+).
9.45 «Паненка і кулінар» (12+).
10.20 «Паехалі» (12+).
10.55, 1.45 «Дзявочнік». Серыял (16+).
14.45 «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
16.05 «Акцёрскія драмы. Сысці ад спакусы». Дак. фільм (12+).
17.00 «Абрабаванне па-жаночаму». Серыял (12+).
20.30 «Без падману» (16+).
21.25 «Атэль «Мэрыголд». Трагікамедыя (12+).
23.45 «Асцярожна, махляры!» (16+).
0.15 «Грань». Серыял (16+).
5.15 «Нераскрытыя таямніцы» (12+).

ТБ1000

6.10, 17.30 Малышка на мільён (16+).
8.50 Ілюзія падману (12+).
11.10 Чарлі і шакаладная фабрыка (12+).
13.30 Каханне жыве тры гады (16+).
15.30 Паранорман, або Як прыручыць зомбі (6+).
20.10 Змрочныя цені (16+).
22.20 Ілюзія падману-2 (16+).
0.45 Джэкі (18+).
2.30 Якая бяжыць ад рэальнасці (18+).
4.00 Пераправа-2 (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Пятніца (16+).
8.05 Уцёкі (16+).
10.25 Вясёлыя рабяты;) (12+).
12.15 Асліная шкура (12+).
13.55 Прыстойныя людзі (16+).
15.45 Ганна Карэніна. Гісторыя Вронскага (12+).
18.20 Бяжы! (16+).
20.20 Чорная маланка (0+).
22.25 Змешаныя пачуцці (16+).
0.10 Здрада (16+).
2.30 Правадыр разнаскурых (16+).
4.05 Поп (16+).

National Geographic

6.00 Аўта-SOS. (12+).
6.45, 5.10 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
8.00, 10.20 Неверагодны доктар Пол. (16+).
8.50, 12.35 Золата Юкана. (12+).
9.30 Дзікі тунец. (12+).
11.50, 21.10, 0.20 Інстынкт выжывання. (16+).
13.20, 19.35, 1.55 Сапраўдны геній. (12+).
14.50 Маманцёнак: застылы ў часе. (12+).
15.40 Пачатак. (16+).
17.15 Смяротны бой дыназаўраў (12+).
18.00, 22.00, 1.10 Асушыць акіян. (12+).
18.45, 22.45 Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).
20.20 Сіла племені. (16+).
23.35 Дзіўная Другая сусветная. (16+).
3.30 Інжынерныя ідэі. (12+).
4.25 Вядомы Сусвет. (12+).

Discovery

8.00, 10.30 Як гэта ўстроена?
11.00, 2.00 Чыгунка Аўстраліі.
12.00, 1.00 Скарб Купера.
13.00 Голыя і напалоханыя.
14.00 Зорнае выжыванне.
15.00 Мяцежны гараж.
16.00 Металаломшчыкі.
17.00, 19.30 Паляўнічыя на рэліквіі.
20.00 Махінатары.
23.00 На краі зямлі.
0.00, 7.10 Вулічныя гонкі.
2.55 Бітвы робатаў.
3.50 Хакер у дзікай прыродзе.
4.40 Хуткія і гучныя.

У праграме магчымы змяненні.
Перадрукоўка праграмы забаронена.

Беларусь 1

7.15 Меладрама «Пісьмо надзеі». (12+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал». (12+).
9.50 «Усё як мае быць».
10.25 «Народная раніца» (6+).
11.05 «Вакол планеты».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «50 рэцэптаў першага». (12+).
13.15, 15.30 Меладрама «Калодзеж забытых жаданняў». (16+).
15.15 «Твой горад».
17.10 Меладрама «Аварыя». (16+).
20.40 Навіны надвор'я.
21.00 «Галоўны эфір».
22.05 Меладрама «Тры шчаслівыя жанчыны». (12+).

Беларусь 2

7.00 М/с «Усё пра Розі» (0+).
7.35 Камедыя «Мамчын сыночак» (12+).
9.05, 20.10 «Тэлебарометр».
9.10 «Свет навыварат. Японія» (16+).
10.15 «На нажах. Атэлі» (16+).
11.15 «Спатканне для мамы» (12+).
12.15 М/с «Качыныя гісторыі» (0+).
13.35, 22.05 «Паненка-сялянка. Міжкантынентальны сезон» (16+).
14.30 «Вяселле ўсляпую» (16+).
16.10 Фантастыка «Пасажыры» (12+).
18.05 «Бітва экстрасэнсаў. 17-ы сезон» (16+).
20.40 «Абмен жонкамі» (16+).
22.00 «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
23.05 «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).
0.00 «Халі-галі». Скетчкам (16+).

Беларусь 3

7.15 «Святыні Беларусі».
7.40, 14.45, 20.15 Навіны культуры.
8.00, 15.00, 20.30 Гэты дзень.
8.05 М/ф (0+).
8.35 «Аты-баты, ішлі салдаты...» Фільм — дзецям (12+).
10.00 «Наперад у мінулае».
10.30 «Нацыянальны хіт-парад».
11.25 «Увага, гаворыць Масква!» Маст. фільм (16+).
15.05 «Гуляй, душа!» Канцэрт Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята».
16.20 «Жывая культура». Творчасць Мар'яна Скрамблевіча, майстра па вырабе музычных інструментаў (аграгарадок Адэльск, Гродзенскі раён, Гродзенская вобласць).
16.50 «Па сямейных абставінах». Меладрама (12+).
19.05 «Ясь і Яніна». Маст. фільм (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Цыган». Маст. фільм, заключная серыя (12+).
22.30 «Час кіно».
22.40 «Блакітная бездань». Драма (16+).

Беларусь 5

6.00, 23.45 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
8.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вулверхэмптан» — «Манчэстэр Сіці».
10.15 Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Кваліфікацыя. Мужчыны. Грузія — Беларусь.
11.55 Піт-стоп.
12.25 Пляжны футбол. Кубак Беларусі. Фінал.
14.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету.
15.35 Мастацкая гімнастыка. Чэлендж-кап. Казань.
17.40 Спорт-цэнтр.
17.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Чэлсі». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
19.45 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Дынама-Мінск». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.45 Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы — 2019. U-19. Беларусь — Румынія.
23.00 Вынікі тыдня.

АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) «Нашы навіны».
7.10 Маст. фільм «Вышыня» (12+).
8.45 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.10 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.25 «Здароўе» (16+).
10.35 «Бесталковыя нататкі» (12+).
11.00 «Слова гонару» (12+).
11.50 Серыял «Мама Люба» (12+).
13.50 «Райманд Паўлс. Мільён пунсовых руж» (12+).
14.50, 16.20 Юбілейны канцэрт Райманда Паўлса (12+).
17.45 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». (16+).
20.00 «Контуры».
21.05 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Працяг (16+).
22.15 Музычны фестываль «Рок за Баброў». Канцэрт беларускіх рок-гуртоў (16+).
23.50 Маст. фільм «Марс» (16+).

СТБ

6.15 «Глядзець усім!» (16+).
6.35, 11.00, 20.35 Дакументальны спецпраект (16+).
8.05 «Няўдачнікаў. NET» Серыял (16+).
10.30 «Цэнтральны рэгіён».
12.25, 13.40, 16.40 «Энігма». Серыял (16+).
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
22.05 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
0.30 Канцэрт «Нашы ў горадзе!» 20 гадоў «Нашаму радыё» (16+).

МІР

6.00 М/ф (0+).
6.30 «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
6.45, 3.05 Маст. фільм «Тры залатыя валасы» (0+).
8.15 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» (12+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Як у рэстаране» (12+).
10.45 «Культ/Турызм» (16+).
11.15 «Здабытак рэспублік» (12+).
11.45 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
12.15, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-4».
18.30, 0.00 «Разам».
4.40 Маст. фільм «Тайны Бургундскага двара» (12+).

РТР—Беларусь

7.00 Пакой смеху.
7.25 Маст. фільм «Верыць і чакаць». (12+).
11.00, 20.00 Весткі.
11.20 «Сам себе рэжысёр». (16+).
12.15 «Ранішняя пошта». (16+).
13.00 «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна». (16+).
13.30 «Калі ўсе дома». (12+).
14.30, 21.45 Серыял «І шарык вернецца». (16+).
22.45 Маст. фільм «Саўдзельнікі». (12+).
0.20 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15 «Ты супер». (6+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Аднойчы...» (16+).
8.55 «Іх норавы». (0+).
9.15 «Хто ў доме гаспадар?» (16+).
10.25 «Першая перадача». (16+).
11.05 «Цуд тэхнікі». (12+).
12.00 «Дачны адказ». (0+).
13.05 «НашСпажыўНагляд». (16+).
14.05 Дэтэктыў «Чорная павуціна». (16+).
16.25 «Следства вялі...» (16+).
18.05 «Новыя рускія сенсацыі». (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.10 Дэтэктыў «Шаман. Новая пагроза». (16+).
21.45 «Зоркі сышліся». (16+).
23.15 Ты не паверыш! (16+).
0.10 «Зразумець і абясшкодзіць». (12+).

8 канал

9.00, 16.15, 18.50, 21.00, 0.25 «Надвор'е».
9.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
9.15 «Мой любімы гадаванец» (0+).
9.45 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў» (16+).
14.10 Маст. фільм «З Расіі з любоўю» (12+).
16.20 Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
16.25 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Пінгвіны».
18.00 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
18.55 Драма «Непрыстойная прапанова» (16+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.05 Меладрама «Прыгажуня і пачвара» (12+).

ВТБ

6.00, 13.00 «Супермамачка» (16+).
7.05 «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
8.10, 4.15 М/ф «Чычы лэнд» (0+)
8.30, 4.30 М/ф «Марын і яго сябры» (0+)
9.00, 4.55 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
9.20, 4.05 «Ералаш» (6+).
10.20 Камедыя «Пятніца» (16+).
12.05 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
14.05, 1.50 Серыял «Маладзёжка» (12+).
16.20, 22.30 «Уральскія пельмені» (16+).
18.00 Рэаліці-шоу «Саюзнікі» (16+).
20.00 Баявік «Карнік» (16+).
23.00 Серыял «Новы чалавек» (16+).
0.00, 5.10 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
1.00 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
3.35 «Проста кухня» (16+).

Культура

6.30, 17.00 «Міхайла Ламаносаў». Маст. фільм. 1—2-я серыі.
7.45 «Пешшу...» Пераслаўль-Залескі.
8.20 Канікулы! «Звераробой». Маст. фільм. 1-я серыя.
9.30 «Партугалія. Замак слёз». Дак. фільм.
10.00, 15.00, 19.30, 23.15 Навіны культуры.
10.20 «Міраж». Маст. фільм.
13.40 Каханне ў мастацтве. «Рыхард Вагнер і Казіма Ліст». Дак. фільм.
14.30 «Тры тайны адваката Плявакі». Дак. фільм.
15.10 «Пісьмы з правінцыі». Краснаярск.
15.45 «Востраў і скарбы». Дак. фільм.
16.30, 2.30 Жыццё выдатных ідэй. «Падарожжа ў паралельныя сусветы».
19.45 «Вільям Пахлёбкін. Рэцэпты нашага жыцця». Дак. фільм.
20.30 Колер часу. Жорж П'ер Сера.
20.40 «Добрай ночы, малыя!»
20.55 «Тоўстыя».
21.20 «Следства вядуць знатакі». Маст. фільм.
23.35 «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
0.05 «Медычы. Уладары Фларэнцыі». Серыял. 1-я серыя. (18+).
1.00 «Асмолаў. Псіхалогія перамен». Дак. фільм.
1.25 Сусветныя скарбы.
1.40 VIII Міжнародны фестываль Vivacello.

Настальгія

6.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР». (12+).
6.50, 13.25, 17.35, 20.00, 21.45, 1.25, 2.45, 3.45, 5.00 Настальгія (12+).
7.00 «Гутарка з Прэзідэнтам СССР». 1991 год (12+).
7.40 Перадача «Бізнес і палітыка». 1992 год (12+).
8.40 «Сустрэча з Салжаніцыным». 1994 год (12+).
9.00 «Быў час». 2009 год (16+).
10.00 Маст. фільм «Печнікі». (16+).
11.25 «СММ». 1990 год (12+).
12.00 «Вакол смеху». 1979 год (12+).
13.40 ВІА «Веселые ребята». «Моладзь і музыка». 1986 год (12+).
15.00 Маст. фільм «Гарадскія падрабязнасці» («Каханне з прывілеямі»). (16+).
18.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «ДКНС: апошнія «дзекабрысты» вялікай імперыі». 2005 год (16+).
18.55 «Погляд». Перавароот». 1991 год (16+).
20.30 Дак. фільм «Скрыжаванне рока». (16+).
21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
23.00 «У гасцях у М. Магамаева». Элвіс Прэслі. 1991 год (16+).
00.10 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1968. 1-я частка. (12+).
1.40 «Майстры мастацтваў». Яўген Лявонаў. 1986 год (12+).
4.00 «Колба часу» (16+).

EuroSport 1

4.00, 7.00, 12.45, 15.45, 19.00, 1.00 Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).
8.30 Веласпорт. «Вуэльта»-2017.
9.30, 23.30 Веласпорт. «БінкБанк Тур».
10.30 Веласпорт. «Арктычная гонка Нарвегіі».
11.30, 22.35 Веласпорт. «Класіка Гамбурга».
0.50 Watts.

Кінакамедыя

0.45 Самы лепшы тата. (16+).
2.40 Дружба і ніякага сексу? (16+).
4.45 Нягледзячы ні на што. (16+).
7.05 (Не)чаканы прынц. (16+).
8.45 Халасцякі ў адрыве. (16+).

10.40 Не ўступіць Штэйнам. (16+).
12.20 Вялікае вяселле. (16+).
14.05 Няхай жыве Францыя! (16+).
16.00 Забойны агеньчык. (16+).
17.50 Любоў-маркоў па-французску. (18+).
19.30 Аднакласніцы: легенда пра золата Фрытана. (16+).
21.30 Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі. (12+).
23.25 Высокі бландзін у чорным чаравіку. (12+).

ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.50 «10 самых» (16+).
8.20 «Доктар І...» (16+).
8.50 «Афоня». Камедыя (12+).
10.30, 3.10 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.10 «Асцярожна, махляры!» (16+).
12.40 «Без падману» (16+).
13.30 «Можаце званіць мяне татам». Маст. фільм (16+).
15.20, 21.55 «Нераскрытыя тайны» (12+).
16.20 «Мой герой» (12+).
17.10 «Развітанне» (16+).
18.05 «Акцёрскія драмы. Сысці ад спакусы». Дак. фільм (12+).
19.00, 1.40 «Вузел лёсу». Серыял (16+).
20.55 «Абрабаванне па-жаночаму». Серыял (12+).
22.50, 4.40 «Уся праўда» (16+).
23.20 «Грань». Серыял (16+).
0.10 «Вайна нявест». Камедыя (16+).
5.05 «Часова даступны» (12+).

ТБ1000

6.10, 18.20 Маёмасць з хвастом (12+).
8.05 Адступнікі (16+).
11.05 Код Да Вінчы (16+).
14.00 Пераправа (16+).
16.30 Міс Пецігру (16+).
20.10 Шпіён па суседстве (12+).
22.00 Вечнасць (16+).
0.15 Крэйсер (18+).
2.35 Голая праўда (16+).
4.10 Леў (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
8.00 Экіпаж (6+).
10.40 Ваўкалакі (16+).
12.25 Бацька салдата (6+).
14.25 Абаронцы (12+).
16.20, 4.20 Прыгажунчык (16+).
18.15 Клушы (16+).
20.20 Лёгкі на ўспамін (12+).
22.00 Юр'еў дзень (16+).
0.40 Каўказскае трыа (12+).
2.25 ПіраМММіда (16+).

National Geographic

6.00 Зона будаўніцтва. (12+).
6.50, 5.35 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
8.00, 13.20 Неверагодны доктар Пол. (16+).
8.45, 10.20, 14.55, 17.15, 21.10, 2.35 Аўта-SOS. (12+).
9.30, 18.45, 22.45 Асушыць акіян. (16+).
11.50, 14.10, 1.50 Золата Юкана. (12+).
12.35, 16.25, 20.25 Інстынкт выжывання. (16+).
18.00, 22.00, 1.05, 4.10 Страчанае золата Цёмных стагоддзяў. (16+).
19.35, 0.20 Расследаванні авіякатастроф. (16+).
23.35 Паранармальнае. (16+).
4.55 Непаражальныя канструкцыі. (12+).

Discovery

8.00, 17.00, 22.00, 4.40 Махінатары.
9.00, 15.00 Бітвы за кантэйнеры.
10.00, 16.00, 21.00 Як гэта зроблена?
11.00, 20.00 Паляўнічыя на склады.
12.00, 18.00 Салдаты няўдачы.
13.00 Скарб Купера.
14.00 Голыя і напалоханыя.
19.00 Узрываючы гісторыю.
23.00, 5.30 Прапажы на продаж.
0.00 Хакер у дзікай прыродзе.
1.00, 7.10 У пошуках скарбаў: Змяіны востраў.
2.00 Не спрабуйце паўтарыць.
2.55 Вулічныя гонкі.
6.20 Хуткія і гучныя.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». (16+).
9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).
10.50, 12.10, 18.45, 19.20 Серыял «Добры хлопец». (16+).
13.05 «Дзіцячы доктар».
13.35 «Дзень у вялікім горадзе».
14.35, 15.25 Серыял «Паміж намі, дзяўчынкамі» (12+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
18.15 «Лёс гігантаў».
21.00 «Панарама».
21.45 Спецыяльны рэпартаж (12+).
0.20 «Сфера інтарэсаў».
1.00 «Дзень спорту».

Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 19.35 «Тэлебарометр».
9.05, 19.40 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.10, 17.35 Серыял «Марозава» (16+).
12.15 «Паненка-сялянка. Міжкантынентальны сезон» (16+).
13.15 «Спатканне з будучыняй» (16+).
14.10, 23.35 «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).
15.10, 22.35 «Улюбёнцы». Серыял (16+).
16.15, 0.30 «Нічога сабе ньюз» (12+).
16.20, 0.35 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
17.10 «Халі-галі». Скетчкам (16+).
20.45, 22.05 «Вяселле ўсляпую» (16+).
22.00 «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Пызы.
8.05, 12.00, 20.00 Навіны культуры.
8.20, 12.15, 20.15 Гэты дзень.
8.25, 18.40 «Людміла Гурчанка». Маст. фільм (12+).
9.15, 18.00 «Апошні дзень». Юрый Нікулін (12+).
9.55 «Я хачу гэта ўбачыць!» Мінск. Частка 1-я (6+).
10.20 «Выйсце ёсць». Аляксандр Анісімаў (12+).
16.30, 2.30 Жыццё выдатных ідэй. «Золата «з нічога», або Алхімікі XXI стагоддзя».
18.10 «Трэзіні. Родам з Тычына». Дак. фільм.
18.50 «Больш, чым каханне». Вацлаў Ніжынскі.
20.40 «Добрай ночы, малыя!»
21.30 Конкурс маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2018». Фінал.
0.05 «Медычы. Уладары Фларэнцыі». Серыял. (18+).
1.30 Хація Буніацішвілі. Канцэрт у Берліне.

Настальгія

6.00 Маст. фільм «Прытворнахворы». (16+).
8.00, 9.45, 11.00, 14.25, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 2.00, 3.45 Настальгія (12+).
8.45 М/ф «Сустракайце бабулю». 1984 год (6+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
13.00 «Вакол смеху». «Рэтра». 1981 год (12+).
18.00 Маст. фільм «Звычайная гісторыя». (16+).
20.15 Фільм-канцэрт «Бенефіс Савелія Крамарава». 1974 год (12+).
23.15 «У гасцях у М. Магамаева». Лайза Мінэлі. 1992 год (16+).
0.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «ДКНС: апошнія «дзекабрысты» вялікай імперыі». 2005 год (16+).
0.55 «Погляд». Пераварот». 1991 год (16+).
2.30 Дак. фільм «Скрыжаванне рока». (16+).
5.00 «У гасцях у М. Магамаева». Элвіс Прэслі. 1991 год (16+).

EuroSport 1

3.30, 11.00 Аўтагонкі. World Endurance.
4.00, 9.00, 11.30, 18.00, 0.00 Watts.
5.00, 13.00 Веласпорт. "Джыра-д'Італія".
6.00, 12.00, 14.00, 22.00, 2.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс».
7.00, 17.00, 23.00 Веласпорт. «Вуэльта»-2017.
8.00 Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).
9.30, 19.00, 0.30 Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
10.00, 20.00 Алімпійскія гульні. «Зала славы».
15.00, 21.00, 1.30 Веласпорт. «Тур Германіі».
18.55, 1.25 Дзюдо.

Кінакамедыя

0.25 Піўная ліга. (16+).
2.00 (Не)чаканы прынц. (16+).
3.40 Не ўступіць Штэйнам. (16+).
5.20 Загадай жаданне. (12+).
7.00 Каханне прэт-а-партэ. (12+).

8.35 Няправільныя копы. (18+).
10.10 Самы лепшы тата. (16+).
12.00 Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі. (12+).
14.00 Аднакласніцы: легенда пра золата Фрытана. (16+).
16.05 Вялікае вяселле. (16+).
17.40 Васабі. (16+).
19.30 Інструкцыі не дадаюцца. (12+).
21.45 Даю год. (16+).
23.35 Хочаш ці не? (16+).

ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.40 «Школа доктара Камароўскага» (6+).
8.10 «Доктар І...» (16+).
8.45, 19.00, 2.10 «Вузел лёсу». Серыял (16+).
10.15, 3.45 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
11.55, 17.15 «Варажбітка» (12+).
13.00, 16.15 «Містычныя гісторыі» (12+).
14.00 «Адкрыта» з Аксанай Байрак (16+).
14.55 «Простыя складанасці» (12+).
15.25 «Натуральны адбор» (12+).
20.50 «Абрабаванне па-жаночаму». Серыял (12+).
21.50 «Савецкія мафіі» (16+).
22.40 «Рэальныя гісторыі» (16+).
23.10 «Грань». Серыял (16+).
0.00 «Чалавек у жалезнай масцы». Драма (12+).
5.15 «Нераскрытыя таямніцы» (12+).

ТБ1000

8.10 Застанься са мной (16+).
9.55 Каханне жыве тры гады (16+).
11.45 Малышка на мільён (16+).
14.15 Адступнікі (16+).
17.10 Код Да Вінчы (16+).
20.10 Роўныя (16+).
22.10 Пераправа-2 (16+).
0.35 Акадэмія вампіраў (12+).
2.40 Вечнасць (16+).
4.35 Вар'яцкі від кахання (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 22 хвіліны (16+).
8.05 Ганна Карэніна. Гісторыя Вронскага (12+).
10.45 Дублёр (16+).
12.30 Анкор, яшчэ анкор! (16+).
14.30 Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
16.20, 4.20 Як выйсці замуж за мільянера-2 (12+).
18.20 Ваўкалакі (16+).
20.20 Правадыр разнаскурых (16+).
22.15 Нягоднік (16+).
0.10 Поп (16+).
2.40 Лёгкі на ўспамін (12+).

National Geographic

6.00 Зона будаўніцтва. (12+).
6.50, 5.35 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
7.40, 13.20 Неверагодны доктар Пол. (16+).
8.30, 17.15, 21.10, 2.35, 4.50 Аўта-SOS. (12+).
9.15, 16.25 Інстынкт выжывання. (16+).
10.05, 14.50 Цуды інжынерыі. (12+).
11.45, 14.05, 1.50 Золата Юкана. (12+).
12.30, 20.25 Сіла племені. (16+).
18.00, 22.00, 0.15, 4.05 Расследаванні авіякатастроф. (16+).
23.30 Расійскія сакрэтныя матэрыялы (16+).

Discovery

8.00, 17.00, 22.00, 4.40 Махінатары.
9.00, 15.00, 23.00, 5.30 Прапажы на продаж.
10.00, 16.00, 21.00 Як гэта зроблена?
11.00, 20.00 Паляўнічыя на склады.
12.00, 18.00 Салдаты нябёдачы.
13.00, 3.50 Вулічныя гонкі.
14.00 Узрываючы гісторыю.
19.00 Мегацягнікі.
0.00 Зорнае выжыванне.
1.00, 7.10 У пошуках скарбаў.
2.00 Не спрабуйце паўтарыць.
2.55 Голыя і напалоханыя.
6.20 Хуткія і гучныя.

ЯКАСЦІ НА ГЕНЕТЫКУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння, дарэчы, вытворчыя магутнасці прадпрыемства загружаны толькі на 60 %.

— За суткі перапрацоўваем 1200—1250 тон малака, а маглі б дзве тысячы і нават болей, — кажа **часова выконваючы абавязкі дырэктара, намеснік дырэктара па эканоміцы холдынга «Бабуліна крынка» Сяргей ГАЛУХІН.** — Адбываецца недазагрузка вытворчасці, і гэта лішнія затраты. Ёсць раёны традыцыйна моцныя па малаку, як Кіраўскі або Магілёўскі, ёсць і слабыя. Але патэнцыял ёсць ва ўсіх.

Нядаўна па даручэнні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама на прадпрыемстве была створана група, якая працуе над якасцю малака і аказвае сельскагаспадарчым арганізацыям тэхналагічную і метадычную дапамогу.

У яе склад увайшлі ветэрынары, заатэхнікі, якія спецыялізуюцца кожны па сваім кірунку. Нехта займаецца ветэрынарнай гінекалогіяй, нехта праблемамі малочнай залозы і гэтак далей.

— Спецыялісты выязджаюць і робяць дыягностыку, даследуюць скрытыя мастыты і яскрава выражаныя клінічныя формы. У гэтым і заключаецца работа над якасцю малака нашай тэхналагічнай групы, — тлумачыць **намеснік дырэктара па сельскай гаспадарцы холдынга «Бабуліна крынка» Алена БОДАК.** — Трэба аддзяляць малако ад хворай жывёлы і здаровай, забяспечыць яго рэалізацыю па гатунках. Калі ёсць магчымасць рэалізоўваць прадукт «экстра» і вышэйшым класам, чаму гаспадарка павінна губляць грошы.

> Асноўныя прычыны — гэта недахоп кармоў і хваробы. Малако — гэта ж тыя самыя кармы, іх якасць. Шмат гаспадарак, якія мы наведвалі, практычна не давалі жывёлам камбікармы, або колькасць іх у рацыёне кароў была нязначная. Безадказнасць, адным словам. Не ажыццяўляецца своечасовая выбракоўка кароў, пра што казаў Прэзідэнт. Адна дае больш малака, другая менш. Агульны вынік кульгае. Ёсць гаспадаркі, дзе за паўгода ад адной каровы надаілі ўсяго 479 літраў малака. Гэта ненармальна.

З 20 ліпеня аддзел выязджае ў раёны і працуе на базе той ці іншай гаспадаркі.

— Наш дзень часта пачынаецца а 3-й гадзіне раніцы, едзем адразу на ранішнюю дойку, — расказвае Алена Бодак. — У панядзелак, напрыклад, працавалі ў Круглянскім раёне на перасовачнай даільнай установцы ААТ «Друць-агра». Да гэтага рабілі агляд жывёл у «Новай Друці» ў Бялыніцкім раёне. Там, дзе работнікі добрасумленна ставяцца да сваіх абавязкаў, праблем няма. Трэба, каб была высокая чалавечая адказнасць. Той жа аператар машыннага даення павінен вылучыць хворую карову і паведаміць пра гэта, каб сітуацыя не абвастралася. Тады ў нас і надоі будуць добрыя, і якасць малака высокая.

А як у іх?

Намеснік губернатара па эканамічных пытаннях Кастрамской вобласці Расіі Юрый МАКАЎ:

— Асноўны ўпор мы робім менавіта на развіццё малочнай жывёлагадоўлі. Ставім мэту забяспечыць сябе малаком і стаць экспарцёрамі. Але ў нас пакуль адчуваецца яго дэфіцыт. У выніку завозім малако з суседніх рэгіёнаў і, безумоўна, аказваем падтрымку тым прадпрымальнікам, якія займаюцца жывёлагадоўляй. Адпаведныя праграмы ёсць на федэральным і абласным узроўнях. Безумоўна, канкурэнцыя вялікая, існуе шмат перапрацоўшчыкаў нашага малака і шмат малочнай прадукцыі, якую да нас завозяць. Вельмі востра стаіць пытанне якасці малака. Аднойчы нашы сяляне звярнулі ўвагу на тое, што ў продажы сустракаюцца падробкі, дзе пад маркай добрасумленнага вытворцы прадаецца вельмі сумніўны прадукт. Быў названы шэраг расійскіх прадпрыемстваў з іншых рэгіёнаў, не вельмі чыстых на руку. Сяляне нават збіраліся аб'яднацца ў нешта накшталт гільдыі, каб супрацьстаяць фальсіфікату. Мы, са свайго боку, робім усё, каб прадухіліць выпадкі падробак.

Кіраўнік кампенсуе страты сам

У Камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама прычыны падзення надояў таксама бачаць у не вельмі якасных кармах і не зусім прафесійных дзеяннях некаторых работнікаў. Таму і работа вядзецца так, каб ліквідаваць гэтыя прабелы.

— Лічбы пакуль не тыя, да якіх мы імкнёмся, але зрухі ёсць, — запэўнівае **першы намеснік старшыні камітэта Алена ШЫБУТ.** — Стаўка робіцца на галштынскую высокапрадукцыйную пароду, быкі якой закуплены нашым дзяржплемпрадпрыемствам. Гэта семявы фонд для ўсёй вобласці. Маці гэтых жывёл давалі па 11 тысяч і болей кілаграмаў малака ў год. Мы ставім планку 7 тысяч. І яе рэальна дасягнуць. Трэба толькі пераадолець шэраг праблем.

Па словах Алены Шыбут, патомства, атрыманае ў выніку асемянення, патрабуе асобых умоў утрымання і кармлення. Галштынцы вельмі разборлівыя ў харчаванні і абы што есці не будуць. Трэба, каб корм быў па максімуме свежы і якасны. Таму сёлета асаблівая ўвага ўдзяляецца закладцы і захаванню травяных кармоў. Усюды па вобласці будуюцца сянажныя траншэі, якія павінны быць гатовыя да верасня. Паралельна закладка сенажу вядзецца па сучасных тэхналогіях — у рулонах. Травы ў гэтым выпадку менш за ўсё псуюцца. Ход закладкі кармоў пільна адсочваюць спецыяльна створаныя камісіі на трох узроўнях — самой гаспадаркі, раёна і вобласці. Прычым, калі абласная камісія выяўляе недахопы, кіраўнік гаспадаркі рызыкуе кампенсаваць страты са сваёй кішэні.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПУНКТЫ РОСТУ

АРЫЕНТАЦЫЯ — ЭКСПАРТ

На Віцебшчыне ўсё часцей укладваюць грошы ў «малочку». У тым ліку і бізнес-структуры з іншых краін. У прыватнасці, інтарэс і рэальныя справы ёсць з боку кітайцаў, славакаў, расіян... У малако цяпер, як канстатуюць эксперты, інвеставаць выгадней, чым у каштоўныя металы. Таму яго, напэўна, можна лічыць «белым золатам».

Кітайскі інтарэс

Інвестары з Паднябеснай вельмі актыўна засвойваюць укладанні ў малочную галіну. Аблвыканкамам з фірмай Drex Food Group Co., Ltd падпісаны дагавор, каб рэалізаваць інвестыцыйны праект па ўзвядзенні фермаў. Гэта кампанія з'явілася на рынку дзесяць гадоў таму. Яна — адна з лідараў у КНР у сферы жывёлагадоўлі, спецыялізуецца на вырошчванні бычкоў, вытворчасці малака і яго рэалізацыі. Геаграфія супрацоўніцтва шырокая — ад Азіі да Аўстраліі.

Гэтага інвестара зацікавіла Беларусь і таму, што на ўзроўні кіраўніцтва краіны падтрымліваюць інвестараў у сельскую гаспадарку. І праект на поўначы нашай краіны — частка рэалізацыі канцэпцыі «Адзін пояс — адзін шлях».

На тэрыторыі канцэрна «Дзецкасельскі» ў Гарадоцкім раёне.

Фірма гатовая ўкласці на першым этапе 200 мільёнаў долараў. Далей — болей... Для параўнання, летась у большасці раёнаў вобласці на такім узроўні быў гадавы бюджэт.

На фермах, якія адпавядаюць усім патрабаванням XXI стагоддзя, плануецца выкарыстоўваць ізраільскія тэхналогіі.

У Сенненскім і Талачынскім раёнах інвестарам для рэалізацыі праекта прапанавалі плошчы — каля 45 тысяч гектараў. Буйны малочны комплекс будзе арыентавацца ў вытворчасці на экспарт. Працаваць для адпраўкі прадукцыі як у Кітай, так і ў краіны Еўрапейскага саюза. А каб перапрацоўваць малако ў экспартарыентаваную прадукцыю, на Віцебшчыне абнаўляюць і мадэрнізуюць абсталяванне заводаў.

Праграмісты... для фермаў

Тут захоча працаваць моладзь! — упэўнена кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама. Акцэнт робяць на тым, што самыя лепшыя і перспектыўныя малочнатаварныя комплексы — патрабаванне часу. Сярод персаналу будуць запатрабаванымі і праграмісты. Стане ў краіне і больш мехатронікаў — прадстаўнікоў новай рабочай прафесіі ў рэспубліцы. Калі даступна растлумачыць, размова ідзе пра рабочых на ўчастках, аперацыях, дзе патрабуецца фактычна інжынерная тэарэтычная і практычная падрыхтоўка.

Такія спецыялісты ўжо працуюць у розных галінах: машынабудоўлі, радыёэлектроніцы, перапрацоўчай прамысловасці і гэтак далей.

Зразумела, што на сучасных фермах будзе неабходны персанал, які зможа абслугоўваць складанае абсталяванне. Фізічная праца будзе мінімілізавана.

Дарэчы, у Віцебскім раёне ўжо некалькі гадоў функцыянуе ферма «Віцебскаблгаза». Калі адкрылася, яе абсталяванне не мела аналагаў. За людзей, якіх можна аднесці да мехатронікаў, амаль усё робяць робаты. Механізаваная сістэма нават кармы загружае сама. Каб кароўкам заўсёды было камфортна, выкарыстоўваецца сістэма, якая рэгулюе вільготнасць, тэмпературу. Адпачываюць рагулі пры інфрачырвоным асвятленні...

У Расію без праблем

У хуткім часе ў рамках V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ўзаемадзеянне краін па сельскагаспадарчым кірунку стане прадметам для абмеркавання па тэматычнай секцыі «Аграрная палітыка Саюзнай дзяржавы: вопыт, праблемы, перспектывы». Вельмі цікавым з пункту гледжання рэдакцыі «МС» падаецца прыклад дзейнасці паспяховага бізнесу расійскіх бізнес-структур у Беларусі.

Гаворка ідзе аб канцэрне «Дзецкасельскім», якому больш за дзесяць гадоў. Ён аб'ядноўвае прадпрыемствы ў паўночнай сталіцы Расіі, дзе знаходзіцца галаўны офіс. А ў Ленінградскай і Варонежскай абласцях перапрацоўвае ўласную прадукцыю, якую далей рэалізуе ў фірменным гандлі.

У Гарадоцкім раёне інвестар уклаў грошы ў «малочку». Комплекс філіяла «Віраўлянскі» замежнага прадпрыемства «Дзецкасельскі-Гарадок» працуе ўжо дзявяты год. Кармавая база — свая. Надоі з каровы адны з самых лепшых у вобласці: летась на адну карову выходзіла па 8087 літраў малака. «Белае золата» вырабляецца найлепшай якасці — 100 % экстра-класа.

Што датычыцца ўмоў працы, то, калі ў многіх замежных фірмах лічбы заробкаў не агучваюць, тут не ўтойваюць, што «па пяцьсот» долараў у эквіваленце самыя старанныя аператары машыннага даення пачалі зарабляць ужо некалькі гадоў таму. Работнікам — бясплатнае харчаванне, прэміі — да юбілеяў, дзяржаўных свят. Тых, з каго бяруць прыклад калегі, запрашаюць у Санкт-Пецярбург на карпарацыйныя святы.

І што немалаважна — праблем са збытам прадукцыі ў Расію, з якімі сутыкаюцца беларускія вытворцы, у іх не было.

Дарэчы, у Беларусі ёсць яшчэ адна «дачка» канцэрна. ТАА «Нарачанская Ніва 2004» знаходзіцца ў Мядзельскім раёне. Фірма створана ў 2004 годзе. Спецыялізацыя такая ж, як і ў Гарадоцкім раёне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД

БЕЗ КРЭДЫТАЎ, СВАІМІ СІЛАМІ

Як свінаферма ператварылася ў ферму па адкорме цялят

Некалі племзавод «Нача» спецыялізаваўся на вырошчванні маладняку свіней. І вытворчасць, дарэчы, атрымлівала датацыі Мінсельгасхарча. А калі названы ды іншыя племзаводы сталі звычайнымі сельгаспрадпрыемствамі і перайшлі пад юрысдыкцыю раёнаў, эканамічная сітуацыя ў гаспадарцы стала развівацца не найлепшым чынам.

— У «Начы» без датацый на свінагадоўлю адразу пайшлі ўніз надоі і прывагі ў галіне буйной рагатай жывёлы. На дарагі камбікорм сродкаў не хапала, абыходзіліся сваім збожжам, такім чынам, кармоў не было ўдосталь ні свінням, ні каровам. Да таго ж свінаферма маральна зжыла сябе. Рэч у тым, што асноўныя яе будынкі ўзводзіліся ў 60-я гады. Сістэма гноевыдалення не вытрымлівала ніякай крытыкі. Так званы адкрыты спосаб азначаў, што жыжа стаяла побач з хлявамі. Кармавы цэх і склад пачалі пакрысе развальвацца. Трэба было неадкладна прымаць рашэнне, — расказвае **дырэктар дзяржпрадпрыемства «Нача» Мікалай ТАРЛЮК.**

Мікалай ТАРЛЮК.

Адным з варыянтаў было разбурыць пабудовы, правесці рэкультывацыю зямлі. Але былая свінаферма размешчана сярод зараснікаў вялікіх дрэў, так што ўвесці ў севазварот землі выглядала надта праблематычна. Ды і на знос мноства цагляных будынкаў з грунтоўнымі фундаментамі патрабуюцца немалыя сродкі. «І мы вырашылі перабудаваць свінаферму ў ферму па адкорме цялят, — расказвае Мікалай Сямёнавіч. — Некаторыя казалі, што вытворчасць ялавічыны справа стратная. Але ж развіццё падразумявае пашырэнне вытворчасці, іншага проста не дадзена. А калі падысці з розумам, пастаратца аптымізаваць затраты... Карацей, мы прыйшлі да высновы, што зусім не лішнім будзе гаспадарцы атрымаць рэальныя грошы ад здачы некалькіх тон ялавічыны жывой вагой у пару, якую не называюць сезонам вялікага малака. Дойны статак мы павялічваем, а прадаваць лепш не маладняк, а гатовую ялавічыну. Гэта па-гаспадарску.

Словам, найперш мы прыступілі да перабудовы былых свінарнікаў пад хлявы для буйной рагатай жывёлы. Зразумела, што памяшканні, у якіх знаходзіліся свінаматкі, выглядаюць замалымі для знаходжання бычкоў і цялушак. Таму іх адрамантавалі і прыстасавалі як спальнае памяшканне, у якое жывёла можа заходзіць па сваім жаданні. А для яе дзённага знаходжання адгарадзілі загоны побач са сценамі хлявоў. І прыбудавалі так званыя кармавыя сталы. У гэтых сталоў забетанаваная падлога, на якую скідваецца корм. Зверху зроблены дах-навес, каб жывёла магла камфортна адчуваць сябе ў любое надвор'е, каб зімой сюды снегу не заганяла. Калі зрабіць гэтыя сталы ўнутры памяшкання, будзе мала месца жывёле, а так месца — дастаткова. Побач з кармасталамі паклалі былыя ў карыстанні шпалы. Купілі іх, дарэчы, за капейкі ў Баранавіцкай чыгункі. Для трактара гэта ідэальная дарога, для фермы ж гарантыя, што трактар заўсёды падвязе кармы своечасова».

Вось гэты ўласны праект увасобілі ў жыццё ў «Начы» за тры гады падрадным спосабам без прыцягнення крэдытаў. Будоўля працягваецца. І ўжо ў першых двух памяшканнях стаяць на адкорме бычкі.

> “Мы прыйшлі да высновы, што зусім не лішнім будзе гаспадарцы атрымаць рэальныя грошы ад здачы некалькіх тон ялавічыны жывой вагой у пару, якую не называюць сезонам вялікага малака. Дойны статак мы павялічваем, а прадаваць лепш не маладняк, а гатовую ялавічыну. Гэта па-гаспадарску.

Вядзецца рэканструкцыя ў памяшканні былога кармацэха. Тут прывялі ў парадак сцены і падлогу, будынак можна будзе выкарыстаць пад склад.

Пакуль на будаўніцтве фермы працуе брыгада рабочых са Століншчыны і прыватнае прадпрыемства з Баранавіч, якое мае міні-завод па выпрацоўцы растворабетоннай сумесі. Гэтае прадпрыемства выгаднае найперш сваёй мабільнасцю. Вымушаны творчасць яны здольныя разгарнуць за адзін дзень. І гэтак жа хутка могуць перадыслакаваць яе ў іншае месца.

Паступова вымалёўваецца тэрыторыя будучай фермы прыкладна на 350 галоў маладняку. Наперадзе работа па добраўпарадкаванні. Мікалай Тарлюк, як былы старшыня сельскага Савета, вялікае значэнне надае пытанням парадку. Няма падстаў сумнявацца, што з часам гэтая ферма будзе выглядаць як належыць.

Пакуль тут працуюць два чалавекі — кормараздатчык і вартаўнік. Да канца года работнікаў будзе больш, ужо і маладога спецыяліста прыгледзелі на пасаду загадчыка фермы па адкорме.

Між іншым, пасля перапрафілявання з'явіліся і іншыя карысныя моманты. Напрыклад, пасля закрыцця свінафермы кармавыя канцэнтраты ў гаспадарцы накіравалі на малочную жывёлагадоўлю, што паўплывала на імклівы рост паказчыкаў. Летась, напрыклад, рэнтабельнасць малака склала 47 працэнтаў, ад каровы надаілі 6800 кілаграмаў малака, сёлета паставілі задачу атрымаць больш за сем тысяч літраў ад кожнай каровы. А з гэтага складваецца і зарплата працаўнікоў, і фінансавая стабільнасць невялікай гаспадаркі ў цэлым.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Ляхавіцкі раён.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи»

№ Лота	Описание	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
№ 1	Станок токарно-винторезный мод. 16ВТ20П-22, инв. № КТ55004	21 360,00	2 100,00
№ 3	Станок токарно-винторезный мод. 16ВТ20П-22, инв. № КТ55002	21 360,00	2 100,00
№ 4	Станок точил.-шлифов. 3к-634, инв. № КТ00020303	1 320,00	260,00
№ 5	Станок точил.-шлифов. 3к-634, инв. № КТ00020280	1 320,00	260,00
№ 6	Станок унив.-заточ. 3В642, инв. № КТ00020362	2 160,00	400,00
№ 7	Стенд для испытаний СИП-800 шлиф., круглый, инв. № КТ00020575	3 360,00	500,00
№ 8	Стол раздаточный SXN 1000x700x900, инв. № КТ50000336; стол раздаточный SXN 1000x700x900, инв. № КТ50000337; стол раздаточный SXN 1100x700x900 мм, инв. № КТ50000327	2 844,00	420,00
№ 9	Теплогенератор ТГТ-150 с левым исп., инв. № КТ1520317	1 920,00	380,00
№ 10	Траверса линейная Л1А3-2,0-3,0, инв. № КТ01520101; токарно-винторезный станок мод. 16ВТ20П -21, инв. № КТ55524	15 132,00	1 500,00
№ 11	Триммер (механизм для усечки усов. деталей), инв. № КТ50000242	1 560,00	310,00
№ 12	Триммер ТР2-46.00.000СБ, инв. № КТ50000243	1 560,00	310,00
№ 13	Триммер ТР2-46.00.000СБ, инв. № КТ50000262	1 560,00	310,00
№ 14	Турникет, инв. № КТ50000272; Устройство считывающее электронное УСЭ-КВП, инв. № КТ01520336	709,20	140,00
№ 15	Универсальный поворотный делительный стол с УЦИ4, инв. № КТ25000	13 200,00	1 300,00
№ 16	Фильтровентиляционный агрегат ФВА 1200УК передвижной, инв. № КТ50000279	2 280,00	400,00
№ 17	Стабилизатор напряжения Solpi-M PDR-50KVA (Разукомпл), инв. № КТ01520105	1 320,00	260,00
№ 18	Универсально консольно-фрез. ст. 6р81 , инв. № КТ00020975	1 920,00	380,00
№ 19	Машина трубогибочная мод. ИВ3429, инв. № КТ49405	6 120,00	910,00
№ 20	Пресс гибочный гидравлический 2-стоечный ПГГ-2, инв. № КТ50000257	1 560,00	310,00
№ 21	Пресс гидравлический П-6328 - 6/у, инв. № КТ50000285	5 520,00	820,00
№ 22	Станок ИВ3429, инв. № КТ50000274	3 720,00	550,00
№ 23	Установка УТ-30, инв. № КТ55007	2 040,00	400,00
№ 24	Установка УТ-30, инв. № КТ55006	2 040,00	400,00
№ 25	Станок зубофрезерный 53А30П, инв. № КТ00021075; Прибор МТЦ-3-1, инв. № КТ30000267; Котел отопительный КСТ25У (с теплообменником), инв. № КТ50000174	7 932,00	1 180,00
№ 26	Станок токарно-винт. ун фт-11, инв. № КТ00020976	3 360,00	500,00
№ 27	Станок токарно-винт. 1к62д, инв. № КТ00020631	3 240,00	480,00
№ 29	Станок токарно-винт. 16К20(РМЦ-1,5), инв. № КТ01520340	6 240,00	930,00
№ 30	Токарно-винторезный станок мод. 16к20, инв. № КТ01520314	6 240,00	930,00
№ 31	Токарно- винторезный станок мод. 16ВТ20П-21, инв. № КТ55534; инвертор сварочный TELWIN TECHNOLGY 220 HD, инв. № КТ50000313	15 252,00	1 500,00

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен произвести оплату Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона

Аукцион состоится 30.08.2018 в 14.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи», проводимом 30 августа 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 28.08.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33

Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57,8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— У 2016—2017 гадах мы такія ж плошчы сеялі практычна два месяцы. Сёлета справіліся за месяц. Кормаўборачная кампанія пачалася рана, як ніколі, 10 мая прыступілі да нарыхтоўкі першых кармоў: падышлі травы. Першы ўкос закончылі ў пачатку чэрвеня. Летась гэтай парой толькі пачыналі ўбіраць, — канстатуе Наталля Мікалаеўна. — Сёння работа па нарыхтоўцы кармоў працягваецца. У параўнанні з адпаведным мінулагоднім перыядам плюсуем на 1,76 кармавых адзінак. На ўмоўную галаву жывёлы назапасілі 13,46 цэнтнера кармавых адзінак. Падчас засухі ў чэрвені, каб нашы рагулі не засталіся зімой без харчу, мы сеялі проса, сорга, пайзу. Нягледзячы на тое, што цяпер займаемся жнівом, папаўняем і кармавую базу. Мы ўжо пралічылі, што харчаваннем на зімова-стойлавы перыяд жывёлу забяспечым, запас будзе большы, чым летась.

> Планамерная работа з году ў год дазволіла раёну выйсці на дастойны ўзровень у жывёлагадоўлі. За тры гады на 140 % павялічылася вытворчасць і рэалізацыя малака.

Яшчэ некалькі гадоў таму некаторыя гаспадаркі раёна сутыкаліся з праблемай недахопу кармоў, якія даводзілася закупляць, пераразмяркоўваць з іншых сельгасарганізацый. Цяпер у Лагойскім раёне забыліся, што калісьці так было. Штогод тут пераразалужаюць, перасейваюць па 5,5—6 гектараў шматгадовых траў, што дае магчымасць з лішкам зрабіць запасы.

Банальна, але факт: малако ў каровы на языку. Як накорміш, так і падоіш. Не хапае сена, фуражу — не працуе жывёлагадоўля. Значыць, няма выручкі і грошай на далейшае развіццё эканомікі. Планамерная работа з году ў год дазволіла раёну выйсці на дастойны ўзровень у жывёлагадоўлі. За тры гады на 140 % павялічылася вытворчасць і рэалізацыя малака. Сёлета ў раёне змаглі ўтрымаць дасягнуты ўзровень, хоць гэта далося нялёгка: засуха. Ды і некаторыя гаспадаркі недапрацавалі з шэрагу прычын. Калі чатыры гады таму Лагойскі раён у рэйтынгу па малаку займаў шаснаццатае месца сярод дваццаці двух раёнаў Міншчыны, то сёлета трымае восьмую пазіцыю. З пачатку года выручка ад продажу «белага золата» павялічылася на 111 %, а прыбытак за паўгоддзе — на 135 %. Вядома, што малако — гэта добрыя заробкі, матэрыяльны дабрабыт, дастойны ўзровень жыцця. Сярэднямесячная зарплата сельскіх працаўнікоў павялічылася да мінулагодняга ўзроўню на 115 % працэнтаў і склала 728 рублёў.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота БелТА.

На паспяховае развіццё любога рэгіёна ўплывае цэлы комплекс розных складнікаў.

Раён жыве, калі будуюцца новыя фермы, гаспадарчыя памяшканні, паляпшаюцца ўмовы ўтрымання жывёлы, укараняюцца новыя тэхналогіі. Уладкаванне сучасных даільных залаў, выкарыстанне робатаў павышае прадукцыйнасць працы. Сіласныя і сянажныя траншэі дазваляюць палепшыць якасць кармоў, зменшыць іх страты.

— За чатыры гады ў нас пабудавана 76 сянажна-сіласных траншэй, сёлета запланавана яшчэ 16, у тым ліку 9 ужо ўведзены ў дзеянне. І хоць у 2017-м мы цалкам былі забяспечаны траншэямі, працягваем іх узводзіць, каб сховішчы кармоў наблізіць да фермаў і выключыць падвоз зімой. Гэта эканоміць паліва і захоўвае якасць, — адзначае Наталля Петрушэнка. — За гэты час узведзены тры буйныя малочнатварныя комплексы: МТФ «Гайна» разлічана на 777 дойных кароў, «Косіна» — на 600 рагуль з даільнай залай. Летась увялі ў дзеянне памяшканне на 300 кароў на МТФ «Калачы», дзе жывёлін дояць робаты.

У вёсцы Атрубак Мінскі камбінат хлебапрадуктаў здаў новы свінакомплекс. Цяпер ідзе яго перадача Барысаўскаму КХП. Сёлета сюды завязуць пагалоўе. За апошні час у раёне ўзвялі 16 клюшачнікаў, на чарзе да канца года — яшчэ тры. У вёсцы Жасцінае аб'ект гатовы на 95 %.

Шмат увагі на Лагойшчыне ўдзяляюць уладкаванню мехдвароў. У 2016 годзе раён заняў першае месца ў вобласці па іх добраўпарадкаванні. Сёлета ж сельгаскааператыў «Лагойскі» выйшаў на другое месца сярод арганізацый. У 2015-м сельгаскааператыў «Астрошыцы» заваяваў трэцяе месца, а ў 2017-м адкрытае акцыянернае таварыства «Харошае» стала першым.

> Калі чатыры гады таму Лагойскі раён у рэйтынгу па малаку займаў шаснаццатае месца сярод дваццаці двух раёнаў Мінскай вобласці, то сёлета трымае восьмую пазіцыю. З пачатку года выручка ад продажу «белага золата» павялічылася на 111 %, а прыбытак за паўгоддзе — на 135 %.

Усё, што зроблена ў раёне, — заслуга нашых кіраўнікоў, спецыялістаў, простых працаўнікоў на месцах, лічыць Наталля Петрушэнка. У раёне падабраны дастаткова прафесійныя кадры, моцная каманда, з якой можна вырашаць усе задачы. І калі камусьці неабходная дапамога, то ніхто не задае лішніх пытанняў: трэба, значыць трэба. Прафесіяналізм, памножаны на ўзаемавыручку, камандны дух — ужо палова поспеху.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

KOPATKA

На тэхніку, фізкультуру і культуру

На пятай пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў абмяркоўвалі пытанні фінансавання.

У цэлым даходы абласнога бюджэту павялічваюцца на 16,2 мільёна рублёў. А ўласныя даходы — на 3,2 мільёна рублёў. Гэта стала магчыма ў выніку перавыканання плана па паступленні падатку на прыбытак, таму можна вылучыць дадатковыя фінансавыя сродкі.

Расходы бюджэту павялічыліся на 61,3 мільёна рублёў — у асноўным за кошт атрымання крэдыту з рэспубліканскага бюджэту.

Апроч іншага 21,6 мільёна рублёў пералічаць Камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаванні, каб сельскагаспадарчыя прадпрыемствы пагасілі запазычанасць перад вытворцамі «МАЗ» і «МТЗ».

На паскораную замену ліфтаў у Віцебску, Оршы, Полацку і Наваполацку накіруюць 19,8 мільёна рублёў. Размова пра тэхніку, якая па графіку да 2021 года адпрацуе свой нарматыўны тэрмін службы. 100 тысяч рублёў — на бягучы рамонт ліфтавага абсталявання.

Для Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Салярцінскага дэпутаты вырашылі вылучыць 117,5 тысячы рублёў. У тым ліку і для набыцця раяля.

13 мільёнаў рублёў накіруюць на рэканструкцыю Лядовага палаца ў Наваполацку.

На прыродаахоўныя мерапрыемствы будзе вылучана 350 тысяч рублёў. У тым ліку — для будаўніцтва другой чаргі палігона цвёрдых бытавых адходаў у Віцебску — 200 тысяч рублёў.

Аршанскаму райвыканкаму пералічаць 250 тысяч рублёў — для рамонту глядзельнай залы Дома культуры ў пасёлку Балбасава.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи»

№ Лота	Описание	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
№ 1	Посудомоечная машина AQUA 50 промышленная, инв. № КТ50000326	1 320,00	260,00
№ 2	Пресс гидравлический П-63286, инв. № КТ00020257	5 400,00	810,00
№ 3	Пресс листогибочный гидравлический, инв. № КТ50000224	8 880,00	1 100,00
№ 5	Пресс листогибочный И 1020, инв. № КТ00021090	2 640,00	390,00
№ 6	Пресс листогибочный И1020А, инв. № КТ50000258	3 840,00	570,00
№ 7	Пресс листогибочный И1020А, инв. № КТ50000259	3 840,00	570,00
№ 8	Пресс листогибочный И1330, инв. № КТ00020930	6 000,00	900,00
№ 10	Пресс ножницы НВ 5222Б, инв. № КТ00021067	4 320,00	640,00
№ 11	Прилавок раздаточный SXEC 926x422x660, инв. № КТ50000330; Прилавок раздаточный SXED 1071x422x660, инв. № КТ50000328; Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850, инв. № КТ50000331; Стол-тумба профессиональный с дверями купе 950x600x850, инв. № КТ50000332; Транспортная дорожка для подносов SXDR 4770x307x30, инв. № КТ50000333; Шпилька КШ-3 (для столовых подносов), инв. № КТ50000334; Шпилька КШ-3 (для столовых подносов), инв. № КТ50000335	2 928,00	430,00
№ 12	Пылеулавливающий агрегат УВП-2000А, инв. № КТ50000180; станок вертик.-фрезерн. 65А80МФ4, инв. № КТ00021260	32 688,00	3 200,00
№ 13	Полуавтомат для дуговой сварки ПДГ-251 УЗ.1, инв. № КТ50000221; Установка зачистная Rotofera F DIN10 110020, инв. № КТ50000359	1 272,00	250,00
№ 14	Распред. устройство, инв. № КТ920853	1 320,00	260,00
№ 15	Станок FINN-POWER, инв. № КТ50000339; цифровой осциллограф RIGOL DS1052E, инв. № КТ01520102	279 936,00	27 900,00
№ 16	Станок вертик.-сверлильн. 2С132, инв. № КТ00020941	1 680,00	330,00
№ 17	Станок вертик.-сверлильн. 2н135, инв. № КТ00020885	1 320,00	260,00
№ 18	Станок вертик.-сверлильн. 2С132, инв. № КТ00020401	1 680,00	330,00
№ 19	Станок внутришлифовальный 3к-2281А, инв. № КТ00020133	10 080,00	1 300,00
№ 20	Станок консольно-фрезерный 6т12-1, инв. № КТ00020541	3 240,00	480,00
№ 21	Станок консольно-фрезерный 6т82-Г, инв. № КТ00020176	2 880,00	430,00
№ 22	Станок конс.-фрезерный 6т-12, инв. № КТ00020559	3 240,00	480,00
№ 23	Станок копировально-фрезерный 6Г463, инв. № КТ00020605	1 680,00	330,00
№ 24	Станок корд.-расточной 2Е-450АФ1, инв. № КТ00020265	10 200,00	1 300,00
№ 25	Станок лазерной резки LaserCUT-4015-3-1.5-S-RT (в компл.), инв. № КТ50000343.	229 200,00	22 900,00
№ 26	Станок ленточнопильный мод. ARG 240 Plus, инв. № КТ49305	2 760,00	410,00
№ 27	Станок плоскошлифов., ош-424Ф1-1, инв. № КТ00020702	4 800,00	720,00
№ 28	Станок прод.-фрез. 6М612МФ4, инв. № КТ00020826	199 200,00	19 900,00
№ 29	Станок профильно.-шлиф. ОШ224Н2, инв. № КТ00020310	3 720,00	550,00
№ 30	Станок радиально-сверлил. 2А554, инв. № КТ00020923; вентилятор Л дв. 5,5-1,5-1500, инв. № КТ50000178	4 368,00	650,00
№ 31	Станок расточной модели 2206ВМФ без ЧПУ и электроприводов (мехбаза к станку инв. № 20966)), инв. № КТ1520344; станок свер.-фр.-раст. с ЧПУ 2206ВМФ4 без мехбазы (м/б № 1520344), инв. № КТ00020966	15 120,00	1 500,00

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен произвести оплату Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона

Аукцион состоится 28.08.2018 в 11.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется нар/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном открытом аукционе по продаже имущества (Лот №___), принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи», проводимом 28 августа 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 24.08.2018 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Гуринович Владимир Геннадьевич, тел. +375 (29) 566 87 33

Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57,8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by• e-mail: torgi@ino.by

Час ісці ў трэнажорку

Школа прыгажосці і здароўя «7 крокаў да амаладжэння» адкрылася ў Пружанах. Цяпер мужчыны і жанчыны могуць займацца на трэнажорах, наведваць інтэрактыўныя прэзентацыі па прыгажосці і здаровым ладзе жыцця, майстар-класы па макіяжы, цырульніцкай справе, доглядзе за скурай. Усё гэта ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Пружанскага ТЦСАН, піша газета «Раённыя будні».

Школа з'явілася ў рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. На такое паляпшэнне якасці жыцця пажылых жыхароў Пружанскага раёна са сродкаў Еўрасаюза было выдзелена каля 11 500 еўра. Трэнажорную залу абсталявалі з улікам узроставых асаблівасцяў спартсменаў, якія тут будуць займацца. Як падкрэсліў старшыня раённага Савета дэпутатаў Мікалай Кудравец, паміж арганізатарамі праекта і кіраўніцтвам раёна склаліся добрыя партнёрскія адносіны: на Пружаншчыне ўжо рэалізавана дзесяць ініцыятыў, фінансуемых ЕС.

Экстрым, але не працы

Аляксандр Амяльчук ужо другі год запар удзельнічае ў гонках з перашкодамі Zone Race. Яго першы забег адбыўся летась, калі ён заняў другое месца, саступіўшы толькі саперніку са Светлагорска. Карэспандэнт «Калінкавіцкіх навін» сустрэўся са спартсменам.

У другіх Zone Race Аляксандр удзельнічаў у камандзе, дзе яны занялі трэцяе месца. Затым былі Bison Race у Лагойску, іншыя старты. І вось нарэшце на чацвёртай Zone Race ў Калінкавічах яго чакаў трыумф — першае месца ў катэгорыі «профі», куды зарэгістраваліся 30 наймацнейшых спартсменаў з розных гарадоў Беларусі, а таксама з Кіева, Масквы і Санкт-Пецярбурга. Аляксандр Амяльчук прайшоў дыстанцыю ў сем кіламетраў з 25 перашкодамі за 42 хвіліны 53 секунды і апярэдзіў найбліжэйшага саперніка на восем хвілін.

Але спорт — гэта толькі хобі. Па прафесіі пераможца — чыгуначнік-пуцявік. Пасля вучылішча размеркаваўся ў сталіцу, але з лютага перавёўся ў Калінкавіцкую дыстанцыю пуці, у цэх дэфектаскапіі, дзе забяспечвае бяспеку руху цягнікоў. У вольны час Аляксандр бегае, займаецца на турніках і адпрацоўвае перашкоды. Стаўшы пераможцам, ён атрымаў кваліфікацыю на еўрапейскія гонкі, якія пройдуць у наступным годзе ў Польшчы. А ў найбліжэйшы час спартсмена можна будзе зноў убачыць на спаборніцтвах у беларускіх гарадах.

Камбайнераў-тысячнікаў — у тур па малой радзіме

Героямі ўрачыстасці сталі найлепшыя камбайнеры Шчучынскага раёна, якія намалацілі больш за тысячу тон збожжа. У гэтай элітнай хлебаробскай камандзе 21 чалавек, піша раённая газета «Дзянніца».

Ушанавалі лідараў жніва старшыня райвыканкама Сяргей Ложачнік, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза банкаўскіх і фінансавых работнікаў Аксана Дзесятнічэнка ды іншыя.

Пасля ўсіх добрых слоў на адрас аграрыяў, што прагучалі падчас ушанавання, усім камбайнерам-тысячнікам уручылі падарунак — пуцёўку-тур па малой радзіме.

Дарэчы, спецыяльны маршрут выхаднога дня для камбайнераў падрыхтаваў прафсаюзны тураператар, а скарыстацца ім можна будзе тады, калі аграрыі завершаць сельгаспрацы.

У Год малой радзімы было вырашана паказаць механізатарам брэндавыя беларускія славутасці, унесеныя ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, — Мірскі і Нясвіжскі палацы.

Жніўныя здабыткі аграрыяў Шчучыншчыны сёлета — гэта больш за 72 тысячы тон збожжа. Што яны бераўліва сабраны і апынуліся ў засеках, заслуга вялікай арміі хлебаробаў.

ШТО ЧАКАЕ «МАЛОЧНЫ» БЕРАГ

У курортным пасёлку Гродзенскага раёна абяцаюць налета добраўпарадкаваць пляжную зону

Вось ужо тры гады ў папулярнай пляжнай зоне курортнага пасёлка Парэчча забаронена купанне. У гэтым сезоне за парушэнне было складзена некалькі пратаколаў. Міліцэйскі патруль выязджае на бераг Малочнага возера, каб кантраляваць сітуацыю.

> Згодна з рашэннем сесіі райсавета, на праект добраўпарадкавання прыбярэжнай тэрыторыі і пляжнай зоны выдзелена з бюджэту 50 тысяч рублёў. Грошы павінны быць асвоены да канца года. Затым трэба будзе шукаць сродкі на само добраўпарадкаванне.

Між тым пляжная зона не пустуе. Блізкасць санаторыя вабіць сюды курортнікаў, нямала прыязджае гродзенцаў. Многія з іх не чулі аб тым, што купанне тут забаронена, таму міліцэйскі патруль выклікае здзіўленне. Але і прадстаўнікі правапарадку разумеюць, што ў спякоту нельга не акунуцца ў ваду, якая не мае ніякіх супрацьсанітарных паказчыкаў. Таму яны папярэджваюць аб тым, каб ніхто не заплываў далёка ад берага.

Неадназначная сітуацыя склалася нядаўна, пасля таго, як былы кіраўнік санаторыя «Парэчча» адмовіўся ад догляду гэтай тэрыторыі. Маўляў, няхай усе выдаткі нясе сельскі Савет. У выніку з узбярэжжа зніклі ўсе лаўкі, сталы, пляжныя кабінкі, месца для мангала, тэнісны корт і нават вялізныя валуны. Дэманціравалі і абгароджаную зону для купання. У сваю чаргу, сельскі Савет не змог узяць такую нагрузку на свой баланс. Таму было вырашана забараніць купанне на пляжы, аб чым папярэджваюць і дзве шыльды на дрэвах. У такім «завіслым» стане праходзіць чарговы летні сезон на Малочным возеры.

Ці непакоіць такая сітуацыя мясцовых дэпутатаў? Анатоль Кужалінаў, дэпутат Парэцкага сельскага Савета, гэту праблему ведае. Ён лічыць, што прыбярэжную тэрыторыю варта замацаваць за моцным гаспадаром, такім, як санаторый «Парэчча». Сельскі выканкам наўрад ці знойдзе сродкі для добраўпарадкавання пляжнай зоны. Тут патрэбны спонсары, якія возьмуць на сябе расходы за нейкі вызначаны ўчастак.

У размове з адміністрацыяй санаторыя высветлілася, што браць на сябе гэту тэрыторыю тут не маюць намеру. Санаторый заняты больш важнымі справамі — ідзе будаўніцтва новага корпуса, акрамя таго, у курорта ёсць свая зона адпачынку з тапчанамі і ўласны аквапарк. Палепшыць стан пляжа тут прапанавалі са сродкаў раённага бюджэту, у які, дарэчы, паступае курортны збор і ад санаторыя «Парэчча».

Святло на будучыню пралілі мясцовыя ўлады. Старшыня Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігар Лябецкі паведаміў, што справа зрушылася з месца. Згодна з рашэннем сесіі райсавета, на праект добраўпарадкавання прыбярэжнай тэрыторыі і пляжнай зоны выдзелена з бюджэту 50 тысяч рублёў. Грошы павінны быць асвоены да канца года. Затым трэба будзе шукаць сродкі на само добраўпарадкаванне. Пакуль тэрыторыя, а гэта два гектары, належыць сельсавету, а потым будзе відаць, зазначыў Ігар Лябецкі.

> Санаторый заняты больш важнымі справамі — ідзе будаўніцтва новага корпуса, акрамя таго, у курорта ёсць свая зона адпачынку з тапчанамі і ўласны аквапарк.

Часовае карыстанне зямельным участкам ажыццяўляе Скідзельская ЖКГ. Камунальнікі выступаюць у ролі заказчыкаў праекта і будучых работ. Па словах начальніка Уладзіміра Ханевіча, добраўпарадкаванне будзе зроблена ў лясной зоне, прыбярэжнай тэрыторыі і непасрэдна ў акваторыі возера. Тут з'явяцца дарожкі, асвятленне, малыя архітэктурныя формы, зоны адпачынку. Непасрэдна на пляжы — навесы, раздзявальні, душавыя... Не будзе недахопу і ў кантэйнерах для смецця (іх тут зараз няма ніводнага). Праект прадугледжвае выратавальную станцыю і пракат лодак. Карацей кажучы, налета абяцаюць пераўтварыць тэрыторыю ў сапраўдную зону адпачынку, якая б адпавядала статусу курортнага пасёлка. Нагадаем, што летась аграгарадок Парэчча ўключаны ў спіс 16 населеных пунктаў Беларусі, якія павінны стаць цэнтрам турызму і адпачынку нацыянальнага значэння.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 16 жніўня 2018 года.